Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ДОЛЯ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкаю да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.	Нэпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 1 — Вільня, Пятніца 3-га жніуня 1928 г. — Год 1

У гэтым нумары 6 страніц.

Без Грамады.

На гэтых днях праведзена ў жыцьцё славутная панская амністыя і на некаторы час пакінула свае ня вельмі цёплыя кватэры пэўная частка людзей. Сучасны віцэ-міністар справядлівасьці, „дэмакрата“ з „Kurjera Wileńsk'aга“, п. Цар, у сваім нядаўным экспозэ хваліўся, што добрадзейства гэтай амністыі даткнулася аж 10.000 грамадзян.

Так гэта, ці не—мусім сьцьвердзіць, што гэтыя „дабрадзействы“ абыйшлі якраз тых, хто найбольш цікавіць беларускія працоўныя гушчы: яны абыйшлі Грамаду, тую арганізацыю, якая абыймала сабою ўвесь беларускі працоўны народ і была адбіцьцём яго думак і настрояў. Стараньні паслоў Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу пашырыць амністыю ў гэтым сэньсе—разьбіліся аб дружны адпор усяе буйнае буржуазіі (не хапіла 10 галасоў), і не далі ніякіх вынікаў. Замест амністыі ўсьлед за Віленскім цэнтральным монстр-працэсам, адбываюцца меншыя працэсы Грамадоўцаў на правінцыі, сам п. міністар справядлівасьці п. Мэйштовіч трэбуе крэдытаў на пабудаваньне новых турмаў, паслы з цяперашняга Беларускага Сялянска-Работніцкага Пасольскага Клюбу — які ўрадам лічыцца за паўстаўшы нанова Клюб Грамады, сядзяць на-нова ў турмах (А. Стагановіч) або спаралізаваны ў сваей дзеяльнасьці (І. Грэцкі), грамадоўцы запаўняюць турмы, ня толькі на абшарах Зах. Беларусі, а загнаны аж у далёкую Пазнаншчыну і Паморра і там, далёка ад родных сем'яў і родных абразоў прыроды—слухаюць пэўна казкі дабрадзейнага віцэ-міністра ды разам з тым ветра ў полі, які ім шуміць ужо колькі раз перасьнёнае слоўца „*дванаццаць*“.

Заходзіць пытаньне, чаму абойдзена Грамада, і адказ напрашваецца сам сабой.

Грамада вырасла з самай проста істоты беларускага селяніна і работніка, яна абхапіла ўсю яго душу; ускалыхнула і паставіла на ногі ўвесь працоўны беларускі народ, паказаўшы яму шлях да вызваленьня.

Пры той барацьбе, якая вядзецца ўсьцяж між пануючымі і паняволенымі клясамі, пры той вастраце барацьбы, якую яна прыймае ў апошні час ува ўсіх капіталістычных гаспадарствах, Грамада, проста як перадавая частка эўрапэйскага працоўнага руху на шляху да адзінае пакуль дзяржавы працоўных, не магла быць „памілавана“. Амністыя для Грамады азначала-б у вачох буржуазіі выпушчэньне з рук лейцаў панаваньня над беларускім працоўным народам. Калі-б адбылася амністыя над грамадоўцамі, то трэба было-б думаць, што буржуазія чуе сябе настолькі моцнай, што не баіцца навет такога сільнага масавага руху, якім быў рух беларускіх сялян і работнікаў, найшоўшы свае вонкавае праяўленьне ў Грамадзе.

Запраўды-ж так ня ёсьць. Можам сьмела сказаць, што буржуазія ня чуецца так моцнай, як яна сьвету праз свае газэты цьвердзіць. Наадварот, між радкоў гэтых газэтаў мы стала адчуваем перапалох буржуазіі перад рухам працоўных. Гэтыя сталыя цьверджаньні курвіленцаў, што Грамада не зьліквідавана, а жыве, ня губляючы ні на духу ні на ліку, гэта баязьнь абшарнікаў з „Słowa“ робіць новыя выбары, гэтая вечная ўвага запраўднаму працоўнаму руху з боку ўсіх буржуазных газэтаў, бяз розьніцы лявізны і правізны—ўсе гэта толькі паказвае, што буржуазія, ня гледзячы на фанфаронства і бравіраваньне—чуе сябе вельмі слабой. Баязьнь даць амністыю і для Грамады толькі падцьвярджаюць гэтую думку аб слабасьці і перапалоху буржуазіі перад рухам працоўных.

Беларускія сяляне і работнікі гордыя з такой „пашаны“ да іх з боку буржуазіі. Гэта толькі паказвае іх сілу, іх запраўды незьліквідаваны дух барацьбы за свае правы, за свой быт, за сваё вызваленьне.

Амністыя без Грамады азначае, што Грамада запраўды жыве!

Песьня аб „Аншлюсе“ (злучэньні).

(Да З'езду нямецкіх хораў у Вене і—справа злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай).

Добра ведама, якую важную ролю ў нацыянальным аб'яднаньні розных народаў — навет пад цяжкім ярмом заборцаў—адыгралі З'езды Арганізаваных Хоравых Таварыстваў. Родная песьня, спарадзіўшыся ў найглыбейшых улоньнях народнай душы — ў часы яшчэ першабытнага народнага адзінства, сьпярша—ў часы смутнай няволі ды падзелу — становіцца для сьведамага ўжо сваей долі і сваіх мэтаў грамадзянства адным з найцэннейшых скарбаў народнага культурнага багацьця і — адным з наймагутнейшых сілаў і прыладаў нацыянальнага адраджэньня. Новая нацыянальная сьведамасьць збудзіўшагася да новага вольнага жыцьця грамадзянства ў роднай народнай песьні насамперш спатыкаецца з тым пачатным стыхійным адзінствам народнай душы, якое існуе, можа—падсьведама, у паасобных сяброў вялікага народнага цэлага, зьяўляючыся залогам яго канчальнага аб'яднаньня і адраджэньня—ў новых, больш зложаных варунках сучаснай грамадзкасьці. Так, з народнай песьні паўстае пасьля, кормячы жыватворнымі сокамі роднай зямлі новае грамадзянства,—запраўдная нацыянальная паэзія культурных грамадзянстваў, паўстае новая літэратура народу, якая ў свой чарод зьяўляецца магутнай прыладай аб'яднаньня і ўваскрасеньня народу — ў новых варунках яго жыцьця зьяўляецца сілай, перамагаючай усе найцяжэйшыя перашкоды, і небясьпекі, якія толькі здумаюць ворагі яго нацыянальнага адраджэньня.

Клясычным прыкладам ролі народных хораў і хоравых таварыстваў у адраджэньні народным зьяўляецца Латвія; няменш клясычным прыкладам непераможнай сілы літэратуры і музыкі, трыумфуючай над страшнейшымі ворагамі нацыянальнага ўваскрасеньня народу, зьяўляецца і Польшча...

Дык наагул кажучы пабітым ды парэзаным народам, — няма чаго адчайвацца. — Трэба перадусім—вучыцца з прыкладаў, якія даюць ім—на навуку ды пацяшэньне! — іх старшыя ці шчасьлівейшыя браты-народы,—захоўваючы толькі за ўсялякую цану нацыянальныя самабытнасьць і адзінства народный — пашыраючы і паглыбляючы іх усімі тымі шляхамі і спосабамі, якія толькі дае духоўная творчасьць — ува ўсіх галінах культуры!

Няма чаго адчайвацца і нам, беларусам — бо-ж і мы маем нягоршыя, як у іншых,—багацейшыя крыніцы і скарбніцы народнага творства, а перадусім—у галіне песьні,—таго галоўнага пачатна-сынтэтычнага твору—выяўленьня народнага духу, з якога як з адзінага караня, вырастаюць усе розналікія роды і віды літэратурных формаў. Вырастае, як бачым, з гэтай чыстай, азброенай толькі ў пекную музыку ды трафнае, спароджанае ў глыбіні душы слова,—навет і нацыянальнае адраджэньне, а па ім і няўхільнае—палітычнае вызваленьне народу!...

Новы прыклад — такой, ужо цалком сьведамай акцыі магутнага народу, штучна парэзанага на кавалкі ў розных дзяржавах, але непераможна імкнучачагася да аб'яднаньня, дае нам цяпер нямецкая нацыя.

Мы ня будзем доўга разводзіць тутака над усім ведамым лёсам нямецкага народу пасьля вайны—ў выніку міру. Можа, як кару за тыя нацыяналістычныя зьдзекі ды гвалты над парэзанымі ды захопленымі пад нямецкую ўладу славянскімі народамі, якія немцы тварылі да вайны, цяпер—пасьля вайны, — немцы на сваім уласным прыкладзе спрабавалі ўсяго таго, што раней чынілі другім.—У выніку Вэрсальскага міру — нямецкі народ аказаўся няменш парэзаным на кавалкі, чым які іншы народ—нявольнік—з тых, што былі вякамі пад немцам... Сучасная Нямеччына, кажуць „усе—нямецкія нацыяналісты“, зьмяшчае ў сябе толькі каля паловы (?) ўсіх немцаў на сьвеце. Дык вось для нямецкага народу, раскіданага па ўсім сьвеце, паўстае вялізарная нацыянальная задача—сабраць у адно ўсе яго парэзаныя кавалкі, стварыўшы з часам вялікую ўсе—нямецкую дзяржаву... Сама па сябе гэтая задача—зусім натуральная: гэта-ж — агульнае імкненьне кожнага народу!—Дык наагул — імкненьне гэтае можна прывітаць з сымпатыяй, — пад варункам толькі, каб гэтае імкненьне да ўласнага аб'яднаньня і волі не пераходзіла ў імкненьне да панаваньня над другімі народамі, у так званы — „імпэрыялізм“!

І вось, перад намі як раз такі тыпова—чысты прыклад такога імкненьня дзьвюх частках аднаго вялікага народу да злучэньня, якое не зьмяшчае ў сябе навет найменшага элементу якога-небудзь імпэрыялізму!

Здарэньні, адбыўшыяся на гэтых днях у Вене, апісаньне якіх мы даем у аглядзе заграпічнага жыцьця, у кожным бесстароньнім прыяцелі вольнасьці народу павінны ўзбудзіць пачуцьці сымпатыі, а ў прадстаўнікоў такіх забітых ды парэзаных народаў, як беларускі народ,—узьняць новую веру ў тое, што няма той сілы, якая-б магла перашкодзіць народу ў яго аб'яднаньні, адраджэньні і вызваленьні, калі толькі ён здабудзе ды выбярэ дзеля гэтага добрыя—верныя шляхі!

Аўстрыяцка-нямецкае аб'яднаньне („Anschluss“)—пытаньне можа бліжэйшых гадоў, калі ня месяцаў! Справядліва кажуць (абураючыся ды заклікаючы за ўсялякую цану захаваць акупацыю на Рэйне!) францускія газэты, што — злучэньне гэта наступіць назаўтра пасьля скасаваньня акупацыі, і тады— ня отрымаеш яго нічым!... Можна дадаць толькі, што — таксама нічым ня отрымаеш і скасаваньня акупацыі!...

Аўстра-нямецкі „Аншлюс“ адбываецца на нашых вачох — пад вясёлую музыку народнай песьні, якая пануе над усім нямецкім грамадзянствам усяго сьвету — шляхом арганізаваных хораў... „Хор“, гэта-ж і ёсьць той момант арганізацыі, без якога навет самая творчая ды кахаючая родную бацькаўшчыну паасобная душа сына свайго народу ня можа дабіцца ніякай перамогі... Скарыстаем і мы з добрай навукі нямецкай.—Сіла каханьня роднага сьвету, азброеньне культуры і арганізацыя—вось тры рэчы, без якіх няма для народу сьветлай будучыны, а — наадварот, з імі перамога над яго цемным лёсам будзе—поўная!

—·—

Вельмі цікаўна, што — на чале гэтага імкненьня нямецкага народу да нацыянальнага аб'яднаньня, якое прапаведывалі дагэтуль нямецкія нацыяналісты, сталі нямецкія сацыял-дэмакраты, а вярней — сталі шырокія працоўныя масы нямецкага народу абедзьвюх нямецкіх дзяржаваў—работнікі і сяляне. Павадыр нямецкіх сацыял-дэмакратаў, старшыня Рэйхстагу Лебэ казаў у Вене — аб „вялікай германскай („ўсе нямецкай“) рэспублікі прышласьці“, дадаўшы, што „згоднай волі 70-мільёнавага народу ніхто на сьвеце ня можа ані загадваць, ані перашкодзіць“!...

Культурнік.

Новае завастрэньне польска-літоўскага канфлікту.

Новая „гутарка Вальдэмараса“.

Пасьля перарыву ў перагаворах Вальдэмарас меў у Коўне новую гутарку з заграпічнымі журналістамі, у якой, як падае „АТЕ“, стараўся скінуць адказнасьць за правал перагавораў на Польшчу.

„Літва, казаў паміж іншым Вальдэмарас, высунула справу адшкадаваньняў — бо лічыць акцыю ген. Жэлігоўскага — бяспраўнай. Польскія-ж контр-дамаганьні адшкадаваньняў—ня толькі беспадстаўныя, але проста цынічныя! Літва адкінула польскі праект беспасрэднай камунікацыі, бо-ж, прыняўшы яго, прызнала-б праўным і канчальным сучасны тэрытарыяльны стан у Віленшчыне. Літва выканала ўсе свае дзяржаўныя і міжнародавыя абавязкі; Польшча-ж імкнулася толькі да адной мэты: змусіць Літву да прызнаньня сучаснага стану граніцаў. Літва не парушыла ў часе перагавораў ані воднай спорнай справы, дамагаючыся з боку Польшчы толькі стварэньня такой атмасфэры, у якой немагчыма была-б якая новая правакацыя, падобная да акцыі ген. Жэлігоўскага. Польшча-ж праводзіла ўсьцяж сваю традыцыйную палітыку,—імкнучыся да ліквідацыі незалежнасьці Літвы. Напр., у сучасных варунках Польшча прапанавала, каб камунікацыя праз Вільню ў Літву адбывалася ня толькі без усякіх візаў (спэцыяльных дазволаў), але навет без усялякага кантролю! І гэта—у часе арганізаваньня бандаў Плечкайтіса, папіранага польскім урадам! Літва высунула трэбаваньне стварыць шырокі нейтральны пас на польска-літоўскім пагранічны, матывуючы гэта якраз жаданьнем забясьпечыць мір і фактам арганізаваньня гэтых бандаў у Польшчы“. У канцы Вальдэмарас падчырквае, што літоўская дэлегацыя ў Варшаве амаль не патрэбавала — перанясеньня перагавораў у другое месца—з прычыны таго, што польская прэса ўсьцяж зьмяшчала вострыя артыкулы проці Літвы. Толькі ўмяшаньне літоўскага ўраду, які пастанавіў не даваць Польшчы ніякага матар'яду для проці-літоўскай прапаганды, спыніла канфлікт на гэтым груньце (!).

Польская і заграпічная, асабліва ж француская, прэса зьмяшчае ўсьцяж артыкулы, востра крытыкуючыя „правакацыйны характар“, заяваў і паступаньня Вальдэмараса. Асабліва абураецца прэса на Вальдэмараса за тое, што ён цьвердзіць, быццам „справа Вільні можа няўхільна выклікаць новую эўрапэйскую вайну“...

Літоўскія фашысты дамагаюцца завастрэньня мераў проці палякаў.

Афіцыяльны орган літоўскага ўраду публікуе пастановы, прынятыя апошнім зьездам „таўтінінкаў“ (нацыяналістаў).

Зьезд, паміж іншым, пастанавіў—у мэтах далейшага удасканаленьня(!) дзяржаўнага апарату (разваленага амаль не цалком самімі-ж літоўскімі фашыстамі...) — прыняць экстрана такія меры:

1) Ніякіх паслабленьняў у стасунку да проці-дзяржаўных элемэнтаў;

2) Усіх чужаземцаў безадкладна выкінуць з усіх штатных пасадаў (чытай палякаў);

3) Забараніць усім ваенным і цывільным асобам, калі яны апрануты ў літоўскія мундзіры, карыстацца якой-небудзь іншай мовай, апрача дзяржаўнай—літоўскай.

Усё гэта мае адразу вылячыць літоўскі дзяржаўны апарат ад усіх яго вадаў ды недахопаў!..

„Канцэнтрацыя шаулісаў“.

„Кур. Варш.“. З літоўскага пагранічча даносіць, быццам—па загаду літоўскіх ваенных уладаў наступіла канцэнтрацыя мабілізаваных атрадаў шаўлісаў (стральцоў) удоўж польска-літоўскай граніцы. Гэта мае быць дэманстрацыяй у адказ на плянаваныя польскія манэўры ў віленскім ваяводзтве. Шаўлісы атрымалі новае ваеннае абмундзіраваньне і ўзбраеньне.

Скарга Вальдэмараса Лізе Нацыяў... на польскія манэўры.

Газэты падалі, што Вальдэмарас—у зьвязку з весткамі ў прэсе — аб праектаваных быццам манэўрах польскай арміі ў Віленшчыне — зьвярнуўся да сэкрэтарыяту Лігі Нацыяў з нотай, зьвяртаючы яго ўвагу на пагражаючую быццам ад гэтага Літве небясьпеку...

У зьвязку з гэтым „ПАТ“ паведамляе, што ніякія манэўры ў Віленшчыне не прадбачаны. У Віленшчыне маюць у верасьні адбыцца толькі звычайныя „цьвічэньні“ вайсковых часьцей у мейсцах свайго пастою, якія што-годна адбываюцца пасьля жніва

Англійскае агенства—аб націску Чэмбэрлена ў Коўне.

Англійскае тэлеграфнае агенства Рэйтэра афіцыяльна паведаміла, што Чэмбэрлен даручыў англійскаму паслу ў Рызе (на тры балтыцкія дзяржавы), каб той рашуча падчыркнуў перад літоўскім мін. загран. спраў, што Англія лічыць пажаданым, каб рэзалюцыя Рады Лігі Нацыяў—у справе канфлікту з Польшчай — была праведзена ў жыцьцё. Аб гэтым, кажа агенства, Чэмбэрлен заявіў у парляманьце; такія-ж шагі, кажа Рэйтэр, маюць зрабіць і паслы Францыі і Нямеччыны.

Цікаўны адказ літоўскага афіцыяльнага органу на націск з боку англійскай і францускай дыпляматыі.

Орган літоўскага ўраду „Літоўскае Рэха" зьмяшчае цікаўныя разважаньні „аб ролі трэцяй стараны ў польска-літоўскім канфлікце", разумеючы над гэтай „трэцяй старанай" — англа-францускую дыпляматыю.

„Гэта трэцяя старана мае вялізарную сілу, і ад яе амаль ня выключна залежыць, ці паміж Літвой і Польшчай дойдзе да паразуменьня. Але-ж дагэтуль гэтая „трэцяя старана" толькі ўтрудняла паразуменьне. „Англійская і француская афіцыяльная прэса", піша „Літ. Рэха",—„разважаючы справу польска-літоўскага спору, выказала столькі нявества дый старонасьці, што,—калі гэтыя самыя англійскія і францускія дзяржаўнікі, якія інсьпіруюць свае газэты, вялі-б надалей сваю „пасярэдніцкую акцыю", дык—ня толькі не давядуць у Усходняй Эўропе да паразуменьня, але наадварот: выклічуць катастрофу. „Літва гатова паступова завязаць з Польшчай нармальныя стасункі, але — на падставе прызнаньня правоў Літвы на Вільню. Націскам-жа на Літву дый пагрозамі ў стасунку да літоўскага ўраду ня будзе дасягнута нічога. Англійская і француская дыпляматыя павінна пашукаць лепш якой кампраміснай фармулы, якую маглі б прыняць абедзьве староны".

З гэтага відаць, што ў Коўні—ня вельмі спалохаліся—шагу Чэмбэрлена!..

Радавы генарал у Коўне.

„Нямецкая газэта „Фоссішэ Цэйтунг" паведамляе, быццам у Коўну несцадзевана прыехаў радавы генарал Судакоў, які спаўняе абавязкі ваеннага дэлегата адначасна ў трох балтыцкіх дзяржавах (Літве, Латвіі, Эстоніі) і стала жыве ў Рызе. У Коўне ген. Судакоў меў нараду з ваен. мін. Даўкантасам. Пасьля Судакоў меў выехаць на літоўска-польскую граніцу, каб — наглядаць за рухамі польскіх войскаў".

Тая ж газэта даведалася, быццам Літва тайна ўсілівае свае вайсковыя часьці на польскай граніцы.

Прыезд ген. Судакова зьяўляецца вынікам вялікай трывогі, якая пануе ў Літве і ў маскоўскіх колах, выкліканай чуткамі аб васеньніх манэўрах польскай арміі ў Віленшчыне". „За Свободу".

Трошкі аб фашызьме.

Фашызм паўстаў у 1918 годзе ў Італіі па сканчэньні сусьветнай вайны. Абраз руін прадстаўляла сабой Эўропа пасьля сусьветнай бойні. 10 мільёнаў работнікаў і сялян сваей кроўю залілі полі ўсяго сьвету. Голад і гора панавала ў работніцкіх і сялянскіх хатах. Для ўсіх паўставала пытаньне — за што? За што і за чый дабрабыт пралілося столькі крыві? Рэвалюцыйная незадаволенасьць масаў, іх ахвота пакончыць з парадкам, пры якім магчымы такія бойні, знайшла водгук ў цэлай чарадзе рухаў ува ўсіх краёх, паміж іншым і ў Італіі. Пасьля таго, як стала зразумелым італьянскім масам, як брыдка яны былі ашуканы, будучы ўцягнены ў вайну ў інтарэсах англійска-францускага капіталу, і што Італія ніякай карысьці з яе ня мела, пануючыя клясы пачалі дрыжаць за свае панаваньне. Паўстае шырокі сялянскі рух, у рэзультаце якога ўсе двары пераходзяць да народу. Штрайкрухі перайшлі ў масавым пераняцьці фабрыкаў. Большая частка арміі пераходзіць на старану працуючых. Пры выбарах сацыялісты атрымліваюць 150 мандатаў, сяляне 100 мандатаў. Капіталізм дрыжаў у сваіх асновах. Адзін з дыплёматаў на парыжскай канфэрэнцыі выразіўся, што ён сумляваецца, ці мае права рэпрэзантаваць свой край, бо няпэўны, што заўтра, або пасьлязаўтра там выбухне пралетарская рэвалюцыя. Тут аказаўся факт, які кожнаму сяляніну і работніку знаёмы з практыкі, што буржуй і абшарнік толькі тады лібэральны і дэмакратычны, калі яго паднявольныя слухаюцца яго. Як толькі працоўныя масы пачынаюць прачынацца і імкнуцца да свабоды, дэмакратычнасьць і лібэрнасьць гэтых панкоў выскаківае адразу з галавы.

І вось, калі толькі буржуазія пабачыла, што ў межах дэмакратычнага ладу, пралетарыят можа з'арганізавацца і ўступіць у барацьбу за ўладу — паўстаў фашызм. Як бачым у парляманцкім гаспадарстве, пралетарыят можа толькі з'арганізавацца, але да ўлады ніколі мірным шляхам прыйсьці ня можа, дзеля гэтага слушным зьяўляецца пагляд на парлямант, як на прыладу панаваньня буржуазіі, якая, як толькі апошні зробіцца нябясьпечным для яе, знойдзе спосаб зьнішчыць яго.

Фашыстаўская партыя, на чале якой стаў рэнэгат сацыялізму Бэнітто Муссоліні, імкнулася, каб—1) фізычна зьнішчыць усіх палітычных павадыроў працуючых; 2) скасаваць парлямант і 3) ўвясьці парадак, пры якім улада афіцыяльна і безагранічӑньня знаходзілася-бы ў руках заможных клясаў. Першае яны дасягнулі, робячы крывавывая напады на сацыялістычныя лёкалі, прафэсыяльныя саюзы і сялянскія каапэратывы. Захапіўшы ўладу, яны пассылалі і замучылі ў турмах некалькі тысячаў людзей. Кожная арганізацыя, апрача фашыстаўскай і буржуазыйнай, была забаронена. Парлямант разагнаны. Улада была перададзена ў рукі рады, якая складалася з прадстаўнікоў купцоў, індустрыяльных саюзаў і фашыстаўскіх арганізацыяў. Буржуазія, якая ў дэмакратычным гаспадарстве патаемна з-за кулісаў уплывае на палітыку ўраду, цяпер адкрыта пераняла ўладу. Пэўны ўплыў на фашыстаў зрабіў прыклад расейскай рэвалюцыі. Тут бачым шчырасьць працуючых масаў, якія не маскіруючы сваіх імкненьняў адкрыта выступілі і сказалі: „Гаспадарства можа знаходзіцца ў руках працуючых, або ў руках буржуазіі. Ніякія сярэдзіны немагчымы; і бальшавікі гаварылі: мы імкнемся да дыктатуры сялян і работнікаў, якая павінна задушыць панаваньне буржуазіі". Фашысты перанялі тую самую думку, толькі з адваротнай стараны. Яны сказалі: „сярэдзіны не патрэбны".

Фашызм імкнецца да палітычнай дыктатуры заможных клясаў. Гаспадарства павінна быць магутным паліцэйска-мілітарыстычным аппаратам для ўтрыманьня прывілегіі і заслугаў багатых процiў атакаў працуючых.

Пасьля таго, як фашысты, дзякуючы трусьлівасьці і здрадніцкай палітыцы сацыялугоды, у 1922 г. захапілі ўладу, буржуазія ўсяго сьвету зрабілася гарачым староньнікам новага кірунку. Асабліва буржуйскія сынкі, маладыя выпасеныя буржуі, баючыся за свае грамадзкія прывілегіі, хочуць затапіць пралетарыят у моры крыві.

Усюды паўстаюць арганізацыі моладзі, сябры якіх займаюцца нападамі на пралетарскія дэманстрацыі, штрайкбрэхарствам і іншымі такімі дэлікатнымі прафэсіямі. За прыкладам Італіі першая пайшла Іспанія, гдзе адмірал Прымо-дэ-Рывэры захапіў дыктатарскую ўладу. Пасьля Літва, гдзе кулакі, разам з літоўскімі мілітарыстамі пабілі рэкорд гвалту над пралетарыятам. Можна зусім пэўна сказаць, што цяпер няма ніводнага гаспадарства, якое б ня імкнулась да фашыстаўскага ладу. Там, дзе гэта па розных прычынах зрабіць нельга, задавальняюцца падтрымліваньнем фашыстаўскіх гаспадарстваў. Італія цяпер зьяўляецца любімцам усіх буржуазных гаспадарстваў. Магутную падпору ў інтэрнацыянальнай палітыцы мае Муссоліні ў кансэрватыўным англійскім гаспадарстве.

Італія і Англія стаяць на чале сусьветнай палітыкі. Мэтай іх—гэта стварэньне усе эўрапейскага блёку процiў адзінай рэспублікі працуючых.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Жалезная дарога падаражэе на 20 проц.

25 мінулага ліпня на прэсавай канфэрэнцыі ў М-ве Камунікацыі міністар Кюн паведаміў прэсу аб пастанаўленьні Рады Міністраў павялічыць на 20 проц. асабовы жалезнадарожны праезд. Падвышка абавязвае ад 15 жніўня гэтага году.

Амністыя.

Гэтымі днямі выйдзе ў сьвет надрукаваны у „Dzienniku Ustaw" вядомая ўжо ўрадавая „амністыя" для палітычных вязьняў, прынятая Соймам 24 чэрвеня гэтага году.

Наскольні гэтая „амністыя" будзе карысна для беларускіх працоўных гушчаў, добра відна кожнаму беларусу з таго, што яе адкінулі прадстаўнікі беларускіх працоўных гушчаў (Белар. Сял.-Раб. Пасольскі Клюб), дамагаючыся такой амністыі, якая была-бы амністыяй і для працоўных Зах. Беларусі.

ППС-ы не даюць гаварыць.

27 ліпня г. г. у Варшаве на пляцы Казімера адбылося справаздаўчае веча камуністычных паслоў. Па прамове пасла Сыпулы ўзяў голас прадстаўнік Лодзкіх камуністаў—пасол Росяк. Калі Росяк закрануў ППС-аў, дык ППС-ы кінуліся на камуністаў, і пачалася бойка, якая скончылася „інтэрвэнцыяй" паліцыі і забаронай далейшага веча.

Як бачым, дык ППС-ы пашлі „ўгору", бо сталі, ня толькі правакатарамі, але ўжо і даўнейшымі царскімі жандармамі і казакамі ў адносінах да працоўных.

Камуністычная дэманстрацыя.

Каля 8 гадз. увечары 25 ліпня г. г. на Мілай вул. ў Варшаве з'арганізаваўся камуністычны наход. Паход складаючыся, паводле „Głosu Prawdy" № 205, з 300 „wyrostków", кіраваўся праз Дзікую вул. на Павіяк.

„Дэманстрацыя мела выразна антыдзяржаўны характар. Камуністычная моладзь дадавала сабе духу выкрыкамі; над натоўпам разьвіваўся сьцяг. Несена некалькі транспарантаў, дамагаючыхся „ашчасьліваньня людзкасьці".

Паліцыя і паліцыйны патруль на матацыклетах, загарадзіўшы дарогу на Дзікай, разагналі дэманстрантаў, у гэтым часе адзін паліцэйскі ранены, ня ведама кім, у руку.

Арыштаваных няма.

Інспэкцыя вастрогаў у Польшчы.

Газэты падаюць, што віцэ-мініст. Справядлівасьці Цар, каля 20 г. м. атрымае водпуск, які думае выкарыстаць на „шырокую інспэкцыю (перагляд) усіх вастрогаў ў Польшчы".

Вельмі сумляваемся, каб гэтая „шырокая інспэкцыя ўсіх вастрогаў" што-колечы аблегчыла для беларускіх вязьняў (палітычных). Хутчэй можна спадзявацца, што гэта інспэкцыя робіцца дзеля таго, каб наглядзець, ці запраўды ўжо перапоўнены вастрогі ў Польшчы (а тым больш на „Крэсах") палітычнымі вязьнямі працоўнай клясы.

„Дэмакрата" з „Kur. Wil." п. Цар дае сам падставы да гэтага.

„Пасланец дэфраўдант".

Апошнімі днямі адзін з пасланцоў Варшаўскай паштовай дэрэкцыі, нейкі Андрукевіч, атрымаўшы 10.000 злотых дзеля разьмену іх на дробныя, прапаў „бяз сьледу".

Як бачым, дык ужо крадуць, ці далікатней „дэфраўдуюць", ня толькі паны ў белых рукавічках, але і іх „паслугачэ" даюць знаць, што яны не дарма труцца каля паноў.

Падвышка для работнікаў.

На дамаганьне гарадзкіх работнікаў у Катавіцах, магістрат прызнаў ім 5 процан. падвышкі.

Забастоўкі.

У маёнтку Лазіска, Пулаўскага павету забаставала 156 работнікаў. Прычына забастоўкі — не выдаваньне работнікам залеглай пэнсіі і дзеннай ардынарыі. Забастоўкай кіруе Прафэсіянальны Саюз земляробных работнікаў.

У Пулавах выбухла забастоўка муляроў і іх памочнікаў, будуючых вайсковыя дамы. Бастуючыя дамагаюцца 16 проц. падвышкі.

Заграніцай.

Грандыёзная маніфэтацыя нямецкіх „пяўцоў"—на карысьць злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай.

Аб тым, якой вялізарнай сілы наладжана была немцамі ўсяго сьвету маніфэстацыя ў Вене на карысьць злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай, кажуць такія лічбы, пададзеныя ў газэтах: у паходзе па вуліцах Вены прымала ўчасьце больш мільёну народу; уся працэсія цягнулася 9 гадз., расьцягнуўшыся

У ПОЛІ.

У полі калышацца сьпелая ніва...
У полі кіпіць ўжо гарачае жніва,
У полі і дома—гарачае лета...
Знаю я, знаю ўсё гэта...

У полі, пад полымем-коскамі сонца,
Брацьця і сёстры працуюць бяско́нца:
Цяжка працуюць з зары да зары
Усе, як адзін—і малы і стары...

У полі чурком з іх крывавы пот льецца
І дзіўная, сумная песьня нясецца,
(А з ею іх пот, іх жальбы, усё гора)
Нясецца праз горы, праз рэкі й вазёры.

Праз пушчы й балоты, праз сіняе неба,
У хмарах і ветры—ўсюды нясецца, —
Усюды шукае, як прагнучы хлеба,
Людзкае і роднае, братняе сэрца.

* * *

І ў цяжкім вастрозе, на краі магілы
Знайшоў ён мяне, гэты родны і мілы
Пот-голас працуючых брацьцяў і сёстраў.
Знайшоў аж за сотні і тысячы вёрстаў—
Знайшоў маё сэрца і ўсё, усё прыпомніў
І радасьцяю, шчасьцем, як вока, напоўніў.
І мне вельмі лёгка, ніякае болі —
Бож-ж я не ў вастрозе, а дома,—на полі.

* * *

Знаю ўсё гэта, закуты няволяй...
Знаю, што дома ня буду я болей
(Не перажыць мне турэмнай пакуты, —
Не пакрышыць яе ржавыя путы)—
Жніва гарачага, шчасьця і волі
Мне ўжо ня ўбачыць ніколі, ніколі,—
Мне, змагару за палепшаньне долі
Вечна працуючай беднае масы,
За вызваленьне яе з-пад няволі
Вечна гультуючай панскае клясы,—
За роўнае жыцьце і працу пад сонцам,
За волю і ўладу працоўных бяско́нца...
Годзі!...
У песьні я чую: апошняе жніва
Іх—гэтай клясы багатых—на мне;
Што зажывуць нашы дзеці шчасьліва,
Як мы цяпер толькі ў мроях і сьне...

* * *

У полі калышацца сьпелая ніва.
У полі кіпіць ўжо гарачае жніва...
У полі гарачая праца, як лета—
Знаю я, знаю ў вастрозе ўсё гэта...

Алеся Ц.

* * *

Сонейка, сонейка косы вясьняныя,
Мілыя госьці—даўно ўжо чаканыя,
Падаюць з неба, з зямлёю цалуюцца,
Зд'ецца навечнасьць зышліся, шлюбуюцца...
Усё, што ў прыродзе жыве,—асьвяжаецца,
Цягнецца ўверх, быццам імкнецца, сьпяшаецца
Штосьці ўзяці ад сонца жыцьцёвае:—
Сілы змаганьня, моцы сталёвае.

Каранова-Вастрог **В. Шкодзіч.**
8/VI—28 г.

Хмарачкі.

Плывуць, лятуць
Хмарыначкі.
З мае бягуць
Краіначкі!

У даль нясуцца мілыя
Па небу лёгкакрылыя
И бурлівыя,
и шчасьлівыя
Па небу лятуць.

У вакне стаю,
Узіраюся
І пра сваю
Пытаюся
Старонку я каханую
Хмарынку сустраканую
І ветрам начную,
Раскудланую
З бурамі ў баю.

Ой, хмарка ты
Каханая,
З-за Буга ты
Прыгнаная,

Скажы, як нашы маюцца,
З нядоляй ці змагаюцца?
Ці змагаюцца
Ня ўгінаюцца
За долю сваю?

І як-бы чуць:
„Трымаюцца!
Яны жывуць!
Змагаюцца,
Ня гнуцца!"... Так бурлівыя
Шапочуць, быццам, сівыя—
Хоць і маўклівыя,
Лёгкакрылыя
І лятуць, лятуць...

Каранова-Вастрог **С. Сіняк.**
17. VI. 28 г.

Яшчэ адно апошняе сказаньне...

„Суседзкая" гутарка з беларусамі.

Гляджу я, гляджу і віджу, што цёмны, няўдзячны Вы народзец-Беларусы! Урад Вам і тое і гэтае—розныя рады, камісію да спраў „мнейшасьцёвых", і паўлюкевічаў, і ўмястоўскіх і яшчэ шмат якіх, а нарэшце і самога „спадара" падсунуў, а Вам ўсё мала! Старонецеся ад іх, быццам ад заразы якой! Уцяляпаліся вось у гэту Грамаду, быццам Вас там хто мёдам карміў! І што там было добрага, каб хто спытаў?

Гэдак ціснулі, усе турмы загрузілі, не аднаму і па рэбрах дасталося, а Вы ўсё сваё правілі, аж пакуль...

Ха-ха-ха! Цяперака скончылася гэта забавачка—папрабуйце толькі, цікні каторы, ды зараз!...

А вось узяць хоць-бы школьнае пытаньне. Хочацца вось Вам на гвалт свае роднае школы!

А пашто, памоему?

Што гэта, да д'ябла, за мова беларуская?!—каго... чаго... аў... оў... зусім нейкая простая, хамская!

Вось панашаму дык зусім інакш—дэлікатненька, лагодненька, пры ўсялякім слове „прошэн пана" навет і ў пастарунак Вас, бунтаўшчыкоў, гэтак просяць і на Лукішкі прысесьць на гадоў пяток — „гжэчнасьць", аж міла слухаць! А беларуская, што?

У ёй-жа-ж многа слоў не хапае! Як Вы пасвайму назавяцё вывядоўцу, угодніка? Няма як!

Ды што і гаварыць — усё далікатней выходзе! Напрыклад, засудзяць каго на гадоў 8, 12-ць — дык павашаму гэта нéяк надта страшна—гадоў! А вось тут зусім іначай — „дванасьце лят"! А ведама-ж улетку цёпленька, сонейка сьвеціць, дык нічога страшнага нямашака.

Дык і куды ты, чалавеча, сунешся са сваёй беларушчынай? Думаеш, пасаду атрымаеш, вучыцелем будзеш — доктарам? — Дудкі! А куды-ж палякі дзенуцца, што-ж яны рабіць будуць? У Польшчу? Бач, якія разумныя! Там для іх нейкае шкоднае для здароў'я паветра. Помніце, як прыехалі сюды — тоненькія, сухарлявыя, а цяпер, дзякаваць Богу, распраўліліся, брушкі ў некаторых пазнаходзіліся...

Кругленькія такія сталі, як агурочкі, аж міла глядзець! Як-жа ім спакінуць Крэсы! Каб ізноў схудалі? Самі падумайце, гэта-ж недарэчнасьць нейкая, аб якой і гаварыць навет ня варта!

Крычыце гвалт. — Давай зямлі—рабіць нечага! — А скуль яе ўзяць, скажэце? Ад

на 35 кілямэтраў! У зьезьдзе прымалі ўчасьце сваімі харавымі саюзамі ня толькі ўсе месты Нямеччыны і Аўстрыі, але і ўсе тыя нямецкія землі, якія пасьля вайны апынуліся пад чужым панаваньнем. Прыехалі таксама нямецкія хоры і з паўдзённай Афрыкі, з Каліфорніі і з Нью-Іорка!..

Француская прэса аб венскай маніфэстацыі.

Француская прэса асабліва абураецца на так спрытна падрыхтаваную — пад відам музыкі—палітычную маніфэстацыю—у чэсьць „аншлюса“ (злучэньня), якая яўна нарушае... Вэрсальскі Трактат. „Замест музыкі — адна палітыка“! Француская прэса з абурэньнем падчырквае, што — у венскай маніфэстацыі на карысьць „аншлюса“ ня можна адрозьніць сацыял-дэмакрата ад нацыяналіста—пангерманца“. Старшыня нямецкага парляманту, Лебэ адкрыта казаў у сваёй прамове — аб „вялікай усенямецкай рэспубліцы прышласьці“... Новы нямецкі канцлер — у гутарцы з газэтным карэспандэнтам — няменш адкрыта заявіў, што „новы ўрад — больш энэргічна, чым папярэднія, будзе старацца аб чымбольш цесным збратаньні Нямеччыны і Аўстрыі“...

Францускія газэты кажуць, што Францыя... ніколі ня згодзіцца на гэтае злучэньне, якое „стварыла-б зусім новае суадношаньне сілаў у Эўропе, не прадбачанае — у Вэрсальскім Трактаце“!.. Ані Францыя, ані Малая Антанта ня згодзяцца на „аншлюс“, які створыць—нямецкую гэгемонію ў Эўропе!.. Адна па аднэй францускія газэты, асабліва—пэўне-ж—органы францускага нацыяналізму і мілітарызму, заклікаюць урад, каб паказаў Аўстрыі і Нямеччыне на ўсю небясьпеку для іх такіх маніфэстацыяў (?!), дый наагул — каб паставіў ясна ўсю справу, заявіўшы, што злучэньне Аўстрыі з Нямеччынай—недапусьцімая рэч наагул. Адна з рэакцыйных францускіх газэтаў трэбуе навет, каб забарона злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай была ўнесена ў трактат Кэллога!..

Толькі японскі пасол...

На грандыёзным абедзе ў венскім магістраце, на якім прэзыдэнт венскага магістрату Зэйтц і старшыня нямецкага парляманту Лебэ адкрыта заклікалі да злучэньня „70-мільёнавы нямецкі народ, якому ніхто ня можа забараніць гэтага“, з прадстаўнікоў Антанты быў толькі японскі пасол. Рэшта былі адсутныя.

Праская прэса аб „венскім сьпеве“.

Праская прэса — згодна з францускай—абураецца на палітычную маніфэстацыю ў Вене — кажучы, што „злучэньне Аўстрыі з Нямеччынай... расхістала-б няўхільна з такім трудам наладжаную (?) раўнавагу ў Эўропе“.

„Паўдзённае Лёкарно“ і „Макэдонскае пытаньне“.

У вапошнія часы, паміж іншымі „Лёкарнамі“, газэты пісалі часта і аб „Лёкарно Паўдзённым“. „Паўдзённае ці — Балканскае Лёкарно“, мела-б — па думцы францускай палітыкі—„забясьпечыць мір на Балканах“—шляхам захаваньня нятыкальнасьці тэрытарыяльнага ладу (граніцаў) паміж дзяржавамі, створанага ў выніку міравых трактатаў. „Балканскае Лёкарно“, таксама, як і ўсялякае іншае, выключала-б навет думку аб якім пераглядзе існуючых граніц і трактатаў, ня гледзячы на тое, што магчымасьць і спосаб перагляду іх прадбачаны навет у самых трактатах.

Але аказваецца, што, як і дзе інш, зусім ня ўсе балканскія дзяржавы здаволены так, як Францыя дый яе падручныя дзяржавы, створаным міравымі трактатамі тэрытарыяльным перадзелам. Дык і „Балканскае Лёкарно“ ўсё неяк „ня выпісываецца“. Як ведама, галоўнай „косьцяй нязгоды“ між Югаславіяй і Баўгарыяй дый — перашкодай на шляху да „Балканскага Лёкарно“ зьяўляецца „Македонскае пытаньне“. А гэтай „косьцяй“ спрытна карыстаецца італьянская палітыка на Балканах, падтрымліваючы трывожны стан на Балканах, дый—адабіваючы Югаславію. Італьянскія ваенныя колы ўсцяж высьвятляюць на старонках фашыстаўскай прэсы, што Баўгарыя ніколі не надпіша ніякага трактату, які-б выражаў перагляду граніцаў з Югаславіяй дый адмаўляўся б ад Македоніі, якая, бяз сумліву—значна больш баўгарская, як сэрбская. Бо-ж ніводны баўгарскі урад, які-б спрабаваў гэта зрабіць, ня ўтрымаўся б ані дня. Фашыстаўская прэса пры гэтым адкрыта дадае, што Італія, падтрымліваючая на Балканах палітыку перагляду трактатаў па перадзелу зямель, ёсьць натуральным праціўнікам такога „Балканскага Лёкарно“...

Як фашыстаўскія дыплёматы лучаць з гэтым усім іх новую палітыку паразуменьня з Югаславіяй, „з якой маюць цяпер узнавіць „трактат прыязьні“, гэта — сэкрэт іх „пчырасьці“...

„Сакрэтная нарада Комінтэрну — у справах польскай і беларускай камун. партыяў“.

„ПАТ“ даносіць з Масквы: „23-га ліпня прэзыдыум Комінтэрну склікаў экстрэнае паседжаньне, на якім разглядаліся справы польскай камун. партыі і „кам. партыі Зах. Беларусі“. Падробнасьці нарады трымаюцца ў сакрэце“.

Трывога ў Маскве.

„Пабыт у Румыніі францускага генарала Ле-Рона ўсцяж непакоіць радавую прэсу. Газэты зырка сачаць за ўсім, што робіць у Бухарэсьце францускі генарал, — адзначаюць яго візыту ў ваеннага міністра і гутаркі з румынскімі вышэйшымі штабавікамі, якія нядаўна езьдзілі ў Варшаву; адзначаюць яго агляд румынскіх ваенных установаў і тое, што ён будзе прысутным на манэўрах у Семіградзьдзі, што зараз—у канцы ліпня мае адбыцца ваенная канфэрэнцыя з учасьцем ген. Ле-Рона, на якой спадзяваліся прыезду і марш. Пілсудзкага, але ён у апошні момант адмовіў свой прыезд.

У Маскве ўсё гэта прыводзіцца ў сувязь з польска-румынскай ваеннай інтэрвэнцыяй, накодам на СССР, які наладжваецца быццам пад кіраўніцтвам Францыі“.

„За Свабоду“.

Інспэктарская падарожа Будзённага ўздоўж заходняй граніцы СССР.

„Кур. Варш.“ даведаўся, быццам Будзённы робіць у сучасны мамэнт — інспэкцыйны дый наглядны аб'езд усёй заходняй граніцы СССР. У сваіх прамовах Будзённы быццам кажа, што чырвоная кавалерыя павінна быць гатовая ў кожную хвіліну—адбіць нападзеньне ворага.

Бэла-Кун у Маскве.

Бэла-Кун мей прыбыць у Маскву 23-га ліпня, каб прыняць учасьце ў Кангрэсе Комінтэрну. Бэла-Куну быццам мае быць даручана „балканская сэкцыя“ Комінтэрну.

Забастоўка-паўстаньне ў Індыі.

Чыгункавая забастоўка на паўдзённа-індыйскай лініі прымае небясьпечныя формы паўстаньня. На вагзале ў Мадрасе натоўп забастоўшчыкаў змусіў машыніста затрымаць цягнік, кінуўся ў вагоны, б'ючы пасажыраў-эўрапэйцаў (англійцаў). Паліцыя—агнём кулямётаў—разагнала натоўп, раніўшы каля 20 асоб. У іншым месьце група бастуючых работнікаў, добра азброеных, акружыла вагзал, высадзіла дынамітам у паветра знаходзіўшыяся на станцыі паравозы, адкруціла рэльсы. Забастоўка чыгуншчыкаў пагражае пашырэньнем на ўсю англійскую Індыю.

У цэлым шэрагу местаў вагзалы заняты паліцыяй і войскам.

Новы японска-кітайскі канфлікт.

Нядаўна новы кітайскі ўрад—нанкінскі, які лічыць сябе прадстаўніком усяго краю, зьвярнуўся да ўсіх вялікіх дзяржаваў, з якімі Кітай мае страшэнна ўстарэлыя і несправядлівыя трактаты, неадказваючыя зусім сучасным варункам, з заявай, што ён пастанавіў наагул перагледзець усе гэтыя трактаты. Цяпер японскі прэм'ер зьвярнуўся да Англіі, Амэрыкі, Францыі і Італіі з заявай аб тым, што Японія ня можа згадзіцца—ані на адмову ад Кітайскага Трактату 1896 г. (!..) ані навет на перагляд гэтага трактату, пакуль кітайскі ўрад ня возьме назад сваю ноту аб адмове ад трактату з боку Кітаю. З гэтага відаць, як цяжка будзе яшчэ новаму Кітаю скінуць з сябе ланцугі няволі, накінутыя на яго імпэрыялістычнымі дзяржавамі—у часе доўгай хваробы краю. На ноту кітайскага ўраду, прапануючую дзяржавам перагляд гандлёвых тратктатаў, японскі ўрад адказаў заявай, што Японія ня прымае да ведама гэтай прапазіцыі. А калі нанкінскі ўрад будзе, ня гледзячы на гэта, лічыць трактат з Японіяй скончаным, тады японскі ўрад прыме свае меры, каб забясьпечыць абарону інтарэсаў сваіх грамадзян у Кітаі.

Ізноў вайна Японіі з Кітаем.

Паразуменьне манчжурскага валадара, сына Чанг-Тсо-Ліна, з нанкінскім урадам выклікала страшэннае абурэньне і трывогу ў японскім урадзе, які — прыняў усе меры, каб парваць гэтае паразуменьне. У выніку страшэннага націску з боку Японіі — Чанг-Ю-Сін (сын Чанг-Тсо-Ліна) выслаў да Чанг-Кай-Шэка тэлеграму, у якой адкрыта заявіў, што — пры ўсім жаданьні адбудаваць адзінства Кітаю і захаваць хатні мір — ён змушаны—па трэбаваньню японцаў—спыніць перагаворы... А тым часам — у Шантунгу ўжо ўзнавіліся крывавыя баі паміж паўдзённай арміяй і японцамі, яўна справакаваўшымі новую вайну. Англійскія крыніцы кажуць, што Японія адкрыта парвала ўжо афіцыяльныя стасункі з нанкінскім урадам. На апошнім парадным абедзе ў Чанг-Кай-Шэка былі ўсе замежныя дыплёматы, апрача японскага. З гэтага відаць, якія „меры“ прыняла Японія—„для абароны сваіх інтарэсаў“...

Амэрыка, наадварот—вельмі прыхільна да новага кітайскага ўраду.

Амэрыканскі пасол у Пэкіне Мак-Мурэй — вельмі прыхільна адносіцца да новага кітайскага ўраду, падтрымліваючы яго ў яго пачынаньнях. Амэрыка ня толькі згаджаецца на перагляд усіх несправядлівых, як кажа слушна кітайскі ўрад, трактатаў, накінутых Кітаю дзяржавамі, але сама мае ўзяць на сябе пачын — скліканьня канфэрэнцыі заінтэрэсаваных дзяржаў—у справе перагляду гэтых дагавораў.

Японія ізноў заўладала Манчжурыяй.

Англійскае агенства даносіць з Токіо, што сын Чанг-Тсо-Ліна, Чанг-Ю-Сіянг, паведаміў японскі ўрад, што ён пастановіць спыніць перагаворы з нацыянальным кітайскім урадам, дадаючы, што Манчжурыя астанецца вернай умовам, заключаным з Японіяй.

Экспозэ Пілсудскага і яго пасьледзтвы.

Палітычныя падзеі ў Польшчы разьвіваюцца вельмі хуткім тэмпам. Па 3 месячнай „працы“ — на ўхваленьні ўрадавага бюджэту на 1928—1929 год—Сойм распускаецца на вакацыі, на „неазначаны“ час. Усьлед жа прыходзіць і экспозэ марш. Пілсудскага ў справе яго „адстаўкі“ разам з „цэлым габінэтам“. Гэты выступ былога прэм'ера Польшчы заграінічная прэса ацэнівае, як першы шаг да зьмены Канстытуцыі і то па лініі тварцоў траўнявага перавароту. Найбольш у гэтай гутарцы Пілсудскі не задаволены з Польскага Сойму — называе яго Соймам „самаўладных прастытутак“ (suwerennych ladacznic) і кажа, што ўжо даўно мог-бы „разагнаць і прыцісьнуць яго нагою“. Аб паслох адзываецца наступна: „Кожны пасол мае права крычаць, трашчаць, абражаць, пісаць апчэрчыя інтэрпэляцыі... мае права захоўвацца, як сьвіньня і лайдак і, калі-б я (Пілсудскі) не перамог сябе, то нічога-б не рабіў-бы, як біў-бы і брыкаў (kopał) паслоў“. І вось, Пілсудскі перамог сябе і ўступае з сваім габінэтам. Але ўступае так, што ўрад астаецца з тых жа самых Пілсудчыкаў, навет узьвялічваецца (міністар Асьветы), а Пілсудскі астаецца ваенным міністрам і кіраўніком заграінічнай палітыкі. Пілсудскі сьцьвярджае, што ані Прэзыдэнт, ані прэм'ер ня мае такой улады, якую ён жадаў-бы. І дзеля гэтага ён робіць прэм'ерам Бартля, а сам да „патрэбнага“ часу астаецца збоку (афіцыяльна). Вось уся сутнасьць гутаркі Пілсудскага.

Польская буржуазная прэса, прэса капіталістаў і абшарнікаў і іх памочнікаў, інтарэсы якой пры сучаснай уладзе добра забясьпечаны, або маўчыць, або хваліць Пілсудскага. Польская-ж так-званая „левая“ прэса—гэта ППС-ы і „іжэ з імі“ —робяць, з аднаго боку—стыдлівы жэст, быццам у „абароне дэмакратыі“, а з другога, прапануюць ураду вуснамі свайго (ППС-аўскага) марш. Сойму Дашынскага супрацоўніцтва з ім, — блёк „лявіцы“ з адзінкай.

З гэтага бачым, што ілюзіі „дэмакратызму“, „парлямэнтарызму“ і ім падобных „сацыялістычных“ лёзунгаў, якімі яшчэ дзе-ні-дзе ўтрымлівала пры сабе працоўныя гушчы, уся гэтая ганьня здраднікаў інтарэсаў працоўных—лопае па ўсей лініі, па ўсім фроньце.

Гэтую сваю сьмерць, свой развал,—развал апайваньня шырокіх працоўных масаў ілюзіямі парлямэнтарызму—заўважыла і сама „лявіца“ і ратуецца, як мага. Ратуецца рознымі істэрычнымі ўнёскамі, сярод якіх ёсьць навет ўнёскі і аб „тэрытарыяльнай аўтаноміі“, пакуль-што толькі для Зах. Украіны. А раз такія ўнёскі ёсьць для Зах. Украіны, то трэба быць пэўнымі, што гэтая „ласка“ будзе „на ўнёску“ і для Зах. Беларусі. І ўсё гэта, усе гэтыя і „тэрытарыяльныя“ і не „тэрытарыяльныя“ ўнёскі робяцца па ўсей Польшчы канаючай ужо „псэўдолявіцай“ дзеля таго, каб даканаць нейкага „cudu“ — каб ім ізноў ажыць, каб ізноў „акалпачыць“ працоўныя гушчы. Але ўся гэтая „дыплямаваная“ лявіца ня бачыць у агоніі і ня ведае таго, што ведае кожнае дзіця: — што „пасьля сьмерці няма пакаяньня“ і што: „мёртваму кадзіла не паможа“.

А працоўныя ўсей Польшчы, усіх яе вёсак і гарадоў наглядна ўжо ўбачылі ўсю праўду—праўду сьмерці якой бы то ні было абароны гэтай „лявіцай“ іх інтарэсаў і толькі чакаюць калі прыдзе іх час, сказаць сваё апошняе слова: „злазьце, дурні, з даху і ня псуйце гонтаў“.

І яны гэта скажуць.

А за колькі часу, — залежыць ад таго, як шпарка будуць ісьці палітычныя падзеі ў Польшчы.

абшарнікаў? Бач — якія ласыя на чужую ўласнасьць. А што-ж сказаў-бы з Вас като-ты, каб ад цябе кажух з плячэй зьдзёрлі-б?

Неабходная рэч? А для іх маёткі — таксама неабходная! Што-ж яны тагды, бедныя, рабілі-б? Працаваць фізычна — ня прывыкшы, а ўмыслова таксама ня лёганька — сядзі, як крук, скорчыўшыся, круці матылямі!

Ці-ж гэта ім дараіць?

А хто-ж тагды паехаў-бы ў Швайцарыю на курорты, што-ж рабілі-б магазыны модаў у Парыжы, хто-ж купляў-бы лікёры, парфумы?

Тагды-ж усё жыцьцё на сьвеце замерла-б, балдавешкі Вы! Думаеце ў Расеі ўваскросьлі, як паноў прагналі? Дохнуць цяпер з голаду, ды просяць іх, каб назад вярнуліся, але тыя ня хочуць! — Ведайце, кажуць, хамы, як бяз нас смачна!

Думаеце там падзялілі сялянам зямлю? Не! Ад іх яшчэ адбіраюць бальшавікі, ды аддаюць работнікам—вось як!

Няпраўда? Праўда, шчырая праўда! Умястоўскі і то пісаў аб гэтым у № 18 сваё газэціны, а ён ды каб ня ведаў, што ў Расеі дзеецца? Калі навет, што ў дэфэнзыве наўперад ведае.

Есьць, Вам, кажаце, нечага, галадуеце?

Пазычайце! Есьць-жа ў нас і стэфчыка, і гмінныя і павятовыя і банкі ўсялякія!

Баіцёся, што карову апошнюю прададуць?

Не дапускайцеся да гэтага — канчаецца тэрмін—бяры другую, большую, аддасі гэту і табе яшчэ на пражыцьцё астанецца і гэтак далей. А Вы думалі як? Трэба ў-ва ўсім мець спрыт! Цяперака ня толькі ўрадоўцы гэтак жывуць, але навет і цэлыя гаспадарствы: бяруць напрыклад з Італіі, а як трэба аддаць—пазычаюць з Амэрыкі якіх небудзь 60 мільёнчыкаў, гэта пражывуць, тады яшчэ і яшчэ... і так без канца. Што там думаць наўперад! Пражыў гадок—і дзякаваць богу!

Але, што з Вамі папрасна гутарыць! Ня раз ужо і гаварылася і пісалася аб гэтым, дык і вухом ня кранеце, злыдні! Хоць ты кол ім на галаве чашы! Апанаваў нейкі шатан і той ня просты, а сам містш іхны—бальзабуб! Чыстымі бальшавікамі нарабіліся, бязбожнікамі! Духавенства ўжо асьмельваюцца крытыкаваць.—Дзяруць,—кажуць, — з жывога, з мёртвага!—Дык-жа ж ім ня толькі што, а навет кашулю апошнюю ня шкада аддаць! Гэткае дабрадзейства робяць—збаўляюць Вас, дурняў, ад вечных мук, ад пекла! А там, думаеце, жартачкі? Гэта вам ня Лукішкі! Пападзецеся толькі, чэрці — такое баданьне пшэпровадзяць, што ўсе дэфэнзывы раем пакажуцца! Там ня толькі па пятах, яшчэ спрытней ўмеюць, а шпількі падногці, як запусьцяць, ды не такія маленькія, а вялізныя, тоўстыя! Заенчыш тагды! Будзешь каяцца, што ня даў пану 50 залатовак ды брахаў усяляк, але позна будзе!

Эх, што вам, хамам, гаварыць! Ці-ж вы паслухаеце майго добрага слова? Здаецца, што гэта, як гарохам аб сьцену... Але, што-ж тагды з вамі, чарцямі, рабіць?! Толькі і застаецца ўзяць за каршэнь ды батам, батам!... За каўнер! і сядзі, чахні, калі ты такая непаслушная жывёліна! Эх, каб я меў уладу— скора вас супакоіў-бы! Як закатаў-бы хоць трэцюю частку, не па 12-ць — гэта глупства, а па якіх 30-ць, 40 гадоў!, павешаў-бы якую тысячу, дзеля пастраху, расстраляў-бы са дзьве — сядзелі-б вы ў мяне, як шчамялькі пасьля дожджу. Скора забыліся-б і пра свае школкі, і пра зямельку і пра ўсякую немач!

Пачакайце, бог не бяз міласьці, можа незадоўга і дабяруся да вашай скуры! Дам перцу, калі не зьмягчэеце!

Фашыст.

Польская камуністычная партыя і Комінтэрн.

Бухарын — аб польскім камунізьме.

„ПАТ“ падае з Масквы 22-га ліпня з дакладу Бухарына, прачытанага на кангрэсе Комінтэрну ды надрукаванага ў чарговым нумары „Известій“, — частку, датычучую стасункаў, пануючых у польскай камуністычнай партыі.

„Мы стаім перад вялізарнай небясьпекай, сказаў Бухарын, якая пагражае польскай камуністычнай партыі. Кажучы аб церцях унутры іншых партыяў, належачых да III Інтэрнацыяналу, я мог задаволіцца ўказаньнем на адбыўшыяся ў іх перамены, але— зусім інакш стаіць справа з польскай камуністычнай партыяй. У сучаснай міжнароднай сітуацыі польская камуністычная партыя стаіць на выняткова адказнай пляцоўцы, і роля, якая выпадзе ёй на долю ў выпадку вайны з Радавым Саюзам, — асабліва важная. У гэтым выпадку стане яна адным з найгалаўнейшых прыладаў, якія будзе мець у сваім распараджэньні Комінтэрн“.

Далей Бухарын разводзіў аб тых памылках, якія нарабілі паасобныя фракцыі польскай камуністычнай партыі ў часе „маёвага перавароту“, а пасьля казаў так: „На апошнім зьезьдзе польскай камуністычнай партыі, які — з прычыны бесканечных спорак ды спрэчак паміж абедзьвюма фракцыямі — цягнуўся больш, як 3 месяцы, дэлегаты Комінтэрну сьцьвярдзілі аднагалосна, што ўсе гэтыя спорkі маглі-б быць зьліквідаваны цалком. Аднак-жа — толькі дзякуючы надзвычайнаму націску з боку Комінтэрну зьезд польскай камуністычнай партыі не закончыўся канчальным разломам: без гэтага рашучага ўмяшацельства Комінтэрну мы мелі-б цяпер у польскім камуністычным руху дзела—з дзьвюма партыямі. І такія рэчы, казаў далей Бухарын, дзеюцца тады, калі Пілсудчыкі падрыхтоўваюць вайну, калі для кожнага павінна быць ясна, што вайна гэта скіравана перадусім проці Радавага Саюзу“!

Далей Бухарын выражае жаль, што пілсудчыкам удалося даканаць расколу ў некаторых апазіцыйных партыях Польшчы,— асабліва, што ім удалося расшчапіць на двое украінскую камуністычную партыю і Беларускую Грамаду(?). „Навет больш таго: пілсудчыкам удалося пранікнуць да шырокіх работніцкіх масаў — бо-ж вялікая частка варшаўскіх работнікаў галасавала за сьпісак Пілсудскага. Я думаю, што гэта ня можа быць пагоджана з гонарам камуністычнай партыі і Комінтэрну“!...

„Таварышы, заявіў Бухарын, я пераконаны, што кангрэс аднагалосна дасьць надзвычайныя паўнамоцтвы выканаўчаму камітэту III Інтэрнацыяналу — у мэтах забясьпечаньня адзінства польскай камуністычнай партыі. Бо-ж — лепш будзе, калі мы — у часе вайны — будзем мець дачынен[illegible] з аднэй партыяй. з запраўднымі работнікамі на чале, якія ў часе вайны будуць жаўнярамі рэвалюцыі і будуць з адвагай весьці барацьбу на нашай старане, чым калі мы будзем тады мець 2 арганізацыі, на чале якіх стаяць грызучыяся паміж сабой павадыры, якія ў хвілі небясьпекі павядуць нашу партыю да згубы“.

Пратэст польскага ўраду з прычыны прамовы Бухарына.

Польскі пасол у Маскве Патэк заявіў у Наркоміндзеле заступаючаму Чычэрына Карахану — пратэст польскага ўраду з прычыны гэтай прамовы Бухарына на 6 кангрэсе Комінтэрну.

Пасол Патэк заявіў Карахану, што зьмест прамовы Бухарына, заклікаючай да чыннага ўмяшацельства ў-ва унутраныя справы Польшчы, зьяўляецца яркім нарушэньнем арт. 5 Рыжскага трактату. („ПАТ").

Уся польскаяая прэса востра адгукнулася на гэтую прамову Бухарына.

Дыскусія на кангрэсе Комінтэрну над дакладам Бухарына.

„ПАТ" падае, што на кангрэсе Комінтэрну ў дыскусіі над дакладам Бухарына, аб сучасным міжнародным палажэньні і задачах камуністычных партыяў — у справе папярэджаньня выбуху вайны — прымала ўчасьце 68 прамоўцаў.

Галоўныя павадыры камуністычных партыяў сьцягу найважнейшых дзяржаваў, як Кашэн, Тэльман, Кошэва, Ленскі, а таксама дэлегаты камуністычных партыяў у калёніях — сьцьвярдзілі сваю салідарнасьць з паглядамі Бухарына, падчырківаючы існуючую ўсьцяж небясьпеку вайны і неабходнасьць мабілізацыі ўсіх сілаў — каб зрабіць вайну немагчымай.

Адказ саветаў на польскую ноту.

Заступнік хворага Народнага Камісара Заграпічных Спраў Карахан даручыў 31-VII г. г. паслу ў Маскве Патаку адказ на польскую ноту ў справе выступленьня Бухарына на кангрэсе Комінтэрна. У ноце Карахан падкрэсьлівае, што III міжнародоўка зьяўляецца інстытуцыяй незалежнай і ўрад ССРР адказнасьці за рэзалюцыі, вынесеныя на кангрэсе, на сябе не бярэ.

Наша хроніка.

Галавач і Фідаркевіч на волі. Як паведамляе „Słowo" (№ 173), б. паслы Незалежнай Партыі Хлопскай—Галавач і Фідаркевіч, арыштаваныя разам з грамадаўскімі паслыамі, цяпер выпушчаны на волю—першы пад каўцыю ў тысячу злотаў, другі — з прычыны слабога здароўя—так. Адначасна „Słowo" паведамляе, што за паслямі Ваявудзкім і Балiцкам пасланы гончыя граматы. Цікава, ці толькі згоняць!

Новая беларуская (!?) шулерня. „Słowo" з дня 8 г. месяца падае, што „беларуская" група Умястоўскага атрымала ад „адносьных" уладаў канцэсію на ігру ў Вільні ў так-зв. „лёто".

Гэта называецца ставіць „дзядзьку Пранука" на ўласныя ногі.

Як відна, дык скончана яго песенька — Янка Станкевіч „уступае ў свае правы".

„Спадар" купляе вэлёсыпэды. Як ходзяць чуткі, „Паўлючок" энэргічна раз'яжджае па правінцыі і закладае філіі свайго „Зьвязку". Сваім інструктарам „бедны" Спадар пакупляў вэлосыпэды, з якімі яны раз'яжджаюць таксама.

Бязумоўна-ж — за грошы знойдзеш і купіш усё, але толькі... ня купіш думкі, ідэі. Сколькі ў Паўлюкевіча было арганізацыяў—патрэскалі. Трэснуць і спадаровы.

Канец часопісі „Праваслаўная Беларусь". Як паведамляе „Кур. Віл.", на днях закончыў сваё жыцьце ціхай няпрыкметнай сьмерцяй беларускі тыднёвік „Праваслаўная Беларусь". Як відаць, беларускія сяляне і работнікі ўжо зразумелі непатрэбнасьць такой справы, якую ім думалі паднасіць „нашы апякуны".

З жыцьця беларускай інтэлігенцыі ў Чэхаславаччыне. З знаходзячыхся ў Чэхаславаччыне беларускіх студэнтаў у гэтым годзе скончылі вышэйшую навуку наступныя:

М. Басэвіч і І. Лембовіч мэдыцынскі факультэт чэскага ўнівэрсытэту ў Празе; абое з Случчыны. **М. Рагуля, Р. Тананка і М. Гузоўскі**—агранам. фак. у тым жа ўнівэрсытэце, з Навградчыны. **Г. Дварчанін** — лясны фак., там-жа; з Навградчыны (родны брат белар. пасла Д-ра Ігната Дварчаніна) і **Альжбета Мілаўская**, скончыўшая там-жа палітэхнікум—з Дзьвінску.

Як бачым, дык рады беларускай інтэлігенцыі растуць. Мусім адзначыць, што Міхал Гузоўскі ўжо прыехаў у край, але зразу-ж па прыезьдзе паступіў на службу „за прыличное вознаграждение" да ведамага Янкі Станкевіча.

Як памог віленскі пэпэсаўскі магістрат выпушчаным вязьням. З прычыны амністыі выпушчана ў мінулым тыдні з віленскіх вастрогаў некалькі сот вязьняў.

Многія з іх (каля 150 чалавек)—бедныя беларускія сяляне з далёкай правінцыі, ня маючы грошай на дарогу даехаць дахаты, зьвярнуліся да віленскага магістрату з просьбай, каб ён ім памог купіць білеты.

Замест помачы, магістрат запрапанаваў ім працу (зямляную—капаць раўкі і д.) на якой яны маглі-бы з часам зарабіць на білеты.

Але вось на работу з 150 прасіўшых дапамогі зьявілася толькі 8 чалавек, г. зн. каля 3 прац. А што-ж такое, чаму-ж гэта 97 прац. вязьняў ня прынялі прапазіцыі магістрату, няўжо-ж яны сабе ворагі?—зьяўляецца тут само сабой пытаньне. У тым то і справа, што ніхто сабе ня вораг. Што вельмі малы працэнт вязьняў чуецца на сілах магчы працаваць на такой цяжкай рабоце, як зямляныя—гэта адно. Другое, як можа селянін, у якога дома асталася толькі жонка ды малыя дзеці, астацца самым гарачым летам на няведама які час працаваць у горадзе.

Вось, як спачувае віленскі пэпэсаўскі магістрат беднаму беларускаму селяніну.

Забастоўка. Апошнімі днямі ў фабрыцы паперы ў Нова-Вэрках выбухла забастоўка. Работнікі жадаюць падбаўкі па 50 гр. у дзень.

„Дэфраўдацыя ў Вялейскім старостве. Апошнімі днямі арыштаваны 3 дзяржаўныя ўрадоўцы - дэфраўданты: Міхал Бэроўскі, Озярноўскі і Ян Карчмэр. Выменены былі ўрадоўцамі ў Вялейскім старостве, дзе „здэфраўдавалі kilka-dziesiąt" тысяч злотых.

Нячуваны самасуд над камуністам. Апошнімі днямі працуючы пры адбудове дому ў Чарнявіцах работнік Аўген Плоскі, дыскутуючы на тэму канешнасьці ўвядзеньня ў Польшчы камуністычнага ладу, быццам сказаў між іншым: „Пакуль жыву я і маі таварышы, Польшча доўга не пастаіць".

Чуючы гэтыя словы капрал Косаш, з 3 палка віленскіх сапэраў дастаў рэвальвэр і застрэліў Плоскага.

Сьледзтва быццам давяло, што гэта быў няшчасьлівы выпадак: неасьцярожнае абходжаньне з аружжам.

Так падае гэтую вестку „Słowo" ў 168 н-ры пад загалоўкам: „Przypłacił niecne słowa śmiercią.

Вось яно як!

Муляры дамагаюцца падбаўкі. Надовячы віленскія муляры зьвярнуліся да сваіх працадаўцаў з жаданьнем падвышкі платы з 1,75 грошай на 2 злоты.

Літоўцы нішчаць польскую граніцу. Як інфармуе польская прэса, у часе сьледзтва ў справе забойства Міляноўскага, „банда" шаўлісаў ушкодзіла на польскім боку цэлы рад польскіх гранічных знакаў і зьнішчыла польскі гранічны слуп. На інтэрвэнцыю польскіх уладаў — літоўцы адказалі, што нічога аб гэтым ня ведаюць.

І бальшавікі, як і літоўцы. Як інфармуе польская прэса, надовячы ў ваколіцах Каласова (Навградчына) чырвонаармейцам падстрэлены польскі капрал Кляйда. Рэч адбылася пры наступных варунках. Праходзячы ля граніцы, капрал заўважыў каля аднаго з гранічных слупоў на радавым баку 2-х цывільных і аднаго чырвонаармейца, пільна ўглядаўшыхся ў польскую тэрыторыю. Думаючы, што цывілі хочуць перайсьці граніцу, Кляйда схаваўся ў кусты. Якраз у гэты мамэнт чырвонаармеец выстраліў у яго і раніў у ногу вышэй калена, пасьля чаго зьнік разам з цывілямі.

На інтэрвэнцыю польскіх ўладаў бальшавікі адказалі, што нічога аб гэтым ня ведаюць.

Нелегальны рух на польска-літоўскай і польска радавай граніцах. Газэты падаюць, што ў мінулым чэрвені на польска-літоўскім пагранічча затрымана 263 чалавекі за нелегальны пераход граніцы з Польшчы ў Літву і наадварот.

На польска-радавым пагранічча затрыманы 151 чалавек, з якіх, як газэты падаюць, — 44 западозраных камуністычных інструктараў, 16 хаваючыхся ад вайсковай службы, 40 спрыяючых камунізму, і хочучых перайсьці на сталае жыцьцё у Рады, 35 купцоў ці гандляроў і 16 маючых на тым боку маемасьць.

Суд над камуністам. 23 ліпня г. г. Акружны Суд у Беластоку разглядаў справу нейкага Зонштэйна, арыштаванага там восеньню 1927 г. за камуністычную літэратуру. Зонштэйн засуджаны на 4 гады цяжкага вастрогу, які з прычыны амністыі, зьменшаны на 2 гады і 8 месяцаў.

Новая паштовая ўстанова ў Стоўпцах. Апошнімі днямі ў Стоўпцах адчынена паштова-акцызная (celna) ўстанова і ўстанова вымены. Праз гэтыя ўстановы будуць ісьці звычайныя пісьмы, а таксама вартасьцёвыя і паштовыя пасылкі ў абароце паміж ССРР і Польшчай. Акрамя ССРР, праз Стоўпцы будзе адпраўляцца пошта і ў Кітай і Японію.

У сувязі з гэтым скасаваны ў Вільні і Варшаве вымена і акцыз (clenie) пасылачнага абароту паміж ССРР і Польшчай.

Бітва з паліцыяй ў Ашмяншчыне. Апошнімі днямі, у кірмашны дзень у м-ку Барунах здарылася бойка з паліцыяй. Бойку, як піша „Кур. Віл.", выклікаў „авантурай" нейкі Уладыслаў Халецкі. Авантура пэўна была ў тым, што Халецкі праціўіўся інтэрвэнцыі паліцыі, у часе якой навокал іх сабралося каля 300 чалавек (пераважна п'яных, як піша „К. В.").

Закідаўшы паліцыю каменьнем, натоўп потым перайшоў да атакі з дручкамі і паленамі. Паліцыя пачала страляць і пры помачы надышоўшых з пастарунку „падсілкаў" разагнала натоўп. Халецкі і 10 чалавек арыштаваны.

Надта цікавая праўдзівая прычына такой масавай варожасьці натоўпу да паліцыі. А пэўна, што прычына тут блізка: „як пасьцелемся, так і высьпімся"—кажаў такім выпадку пагаворка.

Бароначыся, паліцыянт раніў штыхом у плечы 37 гадняга гандляра коньмі Копеля Фрыдмана, які арыштаваны і адвезены ў шпіталь.

Прычынай „нападу" „Słowo" выстаўляе пробу жыдоўскіх гандляроў коньмі даставіць у Вільню крадзеныя коні, чаму перашкаджаў паліцыянт, за што яны быццам і пастанавілі яго „zgładzić".

Наскольні гэта праўда—паглядзім.

Напалеонаўскі магільнік. У ваколіцах Нямэнчына, Віленска-Троцкага павету, знойдзена ў часе работы пры будове маста праз Вільлю некалькі дзесяткаў людзкіх шкелетаў, старыя француская манэты, (каля 120 год), рэмні, ваенныя француская гузікі і г. д., што пазваляе прыпушчаць, што гэта магільнік напалеонаўскага войска.

На мейсца магільніка выехала спэцыяльная камісія.

Знаход баброў у Заходняй Беларусі. Апошнімі днямі ў Лідзкім, Баранавіцкім і Стаўпецкім паветах натраплена на цэлы рад баброў, аб якіх, дзякуючы вайне, быў і слух прапаў.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Поп і народ.

(Новыя-Мышыцы, Баранавіцкага пав.).

Ёсьць у нас поп М. Скрынка. Служыць ён з 1922 году. Вельмі часта скарадзіцца на сваіх „прыхаджан", што не шануюць папоў, ня ходзяць да царквы, а галоўнае — ня хочуць плаціць царкоўных трэбаў. „Каб ня гэтыя праклятыя бальшавікі, кажа поп, дык усё было б добра: хадзілі б людзі да царквы, шанавалі-б папоў, плацілі-б царкоўныя трэбы". Але якіх толькі гэты руплівы айцец ня выдумае трэбаў! Задумалася зрабіць новы калодзезь — накладае на грунт па 3 зл.; здумалася накрыць бляхаю царкву — па 12 зл. Мае сабе ў кожнай вёсцы падлізаў-слугаў, людзей зусім цёмных; ходзяць гэтыя людзі па вёсках зьбіраць паповую даніну. Калі які бядняк ня мае грошай ды яшчэ, барані божа, што скажа на папа, дык падлізы даносяць папу, што той бядняк казаў тое, а той гэнае. Тады айцец пачынае лаяцца, называючы беднякоў і багаадступнікамі, і бальшавікамі, і навет чарадзеямі, як гэта было сказана на сялян з вёскі Балабановіч. Цікава, скуль поп ведае, што тыя сяляне чарадзействам займаюцца?

Часта людзі дзівяцца, куды поп грошы дзявае? Царкаў даўно ня крыта, а грошы злуплены! Справаздачы наш айчулек нікому ня даў, хоць два разы абяцаў.

Калі здараюцца хаўтуры, ды гэты папок з сялян-серадпякоў бярэ 5 пудоў жыта, з беднякоў, „па хрысьціянску" — 3 пуды; за хрэст 8 зл., але калі да споведзі не хадзіў, не плаціў царкоўныя трэбы, дык 12—15 зл. заганяе. Але найбольш за вянец. Калі хлапец, які яшчэ не адслужыў у войску, прыйдзе яго прасіць, каб зьвянчаў, дык кажа, абы дзеўка; але, як прыведуць вянчацца, дык загадвае плаціць аж 250 зл.; як гэта здарылася з жыхаром в. Дамашэвіч. Бачыць поп, што гэткім шляхам можна зарабіць, дык ад другога зажадаў 600 злотых.

Вось, браткі, якога айчулька маем! Каб апісаць усе яго „дзеяньні", дык мейсца ў газэце напэўна не хапіла-б! **Селянін.**

Старая хлеб-соль ня помніцца.

(З Вялейшчыны).

Выбралі мы сабе войта, здаецца „нашага". Перад выбарамі быў такім, але калі пачуў, што лейцы ўжо ў яго ўласных руках, то тады яго левая рука аслабела, правая-ж, наадварот — памацнела. Ну й паехаў наш „вуйт", але ў правы бок, левай кіраваць ня мог, дык выставіў хвігу, вось вам, мае памагары, вось вам, мае падпіхачы, за тое, што падапхнулі мяне „ў вуйтоўства"!

Быў сябрам Т-ва Белар. Школы, а ці заікнуўся яму памагчы хоць грошам? Ен баіцца, што „ўлада" пабачыць, ды... падлізацца ня будзе як.

Вось, як скора адвярнуў нос, засьмярдзелі пэўна табе; але помні, што век з пахнючым не пражывеш—прыйдзецца вярнуцца і к сьмярдзючым, тады парахуемся.

Падпіхач.

Царкоўныя пастухі.

(В. Капачы, Палачанскай гм., Маладэчанскага павету).

З даўных часоў народ наш жыве бедна, дзеля таго, што зямлі маюць зусім мала, а сенажаці, можна сказаць, зусім няма, а калі ў каго ёсьць, дык такое балота, што траву ні коні ні каровы ня хочуць есьці.

Дык вось нашыя гаспадары ўжо некалькі гадоў як пачалі сеяць кармовыя травы, як канюшына, віка і г. д. Сёлета дык канюшына ўрадзіла добра, але захацелі гультаі ёй пажывіцца: кожную ноч то ў таго, то ў другога канюшына спасеная. Пастанавілі нашыя сяляне дапільнаваць. І каго, вы думаеце, злавілі? — Царкоўных пастухоў, увесь царкоўны „састаў": Кастусь і Сяргей Сярэбранікі — сыны папа, Барыс Савіч — сын дзяка, Юрэвіч — царкоўны стораж, Янка Паўлоўскі — сын царкоўнага напячыцеля.

Вось і „не крадзі" — запаведзь, з якой вы сабе робіце маску.

Ці мала вам даходу з парахфіі! Ці ня досыць лупіць мужыка!? **Парахвіянін.**

Ці можна было спадзявацца?!

(Вёска Сычавічы, Радашкаўскай воласьці)

Хоць трудна ў сучасны мамэнт жыць у цемнаце на вёсцы, хоць не разумеюць добра нашы сяляне, што ім патрэбна, але лягчэй робіцца на сэрцы, як бачыш ахвярную працу дзяцей, вышаўшых з нашага многапакутнага народу — што вучацца ў беларускіх гімназіях, што ўжо цяпер нясуць праменьні сьвятла ў густы таемны змрок, якім атулена наша вёска. Кожнаму, хто хоць трохі цікавіцца жыцьцём беларускае вёскі вядома — як трудна наагул у вёсцы зладзіць спэктакль: амаль заўсёды адчуваецца недахоп адпаведнага будынку для пастаноўкі спэктаклю і інш. Аднак, ня гледзячы на ўсё гэта, стараньнем вучняў Радашкоўскай Бел. Гімназіі Пётры і Арсеня Арловых, М. Яцыковіча ды вучаніцы Н. Прахішчык быў зладжаны 14 г. м. у в. Сачавічы спэктакль.

Паставілі: 1) „Як мы жаніліся" (перакл. з расейскага) і 2) „Боты" (перакл. з украінскага). Артысты-вучні згулялі свае ролі вельмі добра, вясковыя артысты-аматары хоць выступілі ўсе першы раз на сцэну, адналь гулялі зусім нішто сабе. Пасьля адыграньня гэтых дзьвюх сцэн. рэчаў, адбыліся скокі да раніцы. Даход са спэктаклю, у суме 2.. злотых, пайшоў на карысьць Радашкоўскаг.. Т-ва Бел. Школы. Толькі надта сумна тое, што ёсьць такія подлыя, з нізкімі эгоістычнымі інстынктамі адзінкі, якія не разумеюць, а мо' ня хочуць разумець, таго, што змаглі яны атрымаць адукацыю, дзякуючы вялікай ахвярнасьці лепшых дзяцей Беларускага Народу і што абавязаны цяпер працаваць над падняцьцем культурнага ўзроўня нашае вёскі, якія стараюцца пад пакрыўкай „шырэньня асьветы" разьбіваць культурна-асьветную працу, як напрыклад Марыя Смалонская в. Сычавіч, кончыўшая Рад. Бел. Гімназію. Хто-б мог спадзявацца, што гэтая Смалонская будзе адгаварваць вясковых хлапцоў, каб ня прыймалі ўдзелу ў ладжаньні спэктаклю на дзень 14 г. м. (некаторыя яе паслухалі), што яна будзе адгаварваць сялян, каб ня йшлі на гэты спэктакль і інш., тая Смалонская, якая з дапамогай Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры закладае ў в. Максімаўцы, Радашкоўскае воласьці, прыватную беларускую школу. Пасьля ўсяго гэтага ня трудна дагадацца, якая ў гэтай школе будзе навука. Дык-жа глядзеце сяляне з в. Максімаўкі, каб яе ашукалі сваіх надзеяў! Не вялікае шчасьце — мець гэткую „беларускую" школу...

Чэсьць і слава тым, што і пры гэтакіх абставінах здолелі зладзіць спэктакль і шчырая падзяка тым, што не паслухалі нагавараў розных ашуканцаў, а хоць трохі і прычыніўся да ладжаньня спэктаклю, як і ўсім іншым, што ўшанавалі спэктакль сваей прысутнасьцяй. **Свой.**

Вось дык справядлівасьць!

(В. Пранчакі, Баранавіцкага пав.).

У 1925 гаду зьявіўся ў вёску Пранчакі паліцыянт з Своятыч нейкі Станіслаў Кондак і зажадаў ад солтыса, каб даць яму фурманку да вёскі Федзіюкі да чыгуначнага маста, дык солтыс вызначыў селяніна Антося Бельмача, каторы павёз „начальство" на сваей 1000-златовай кабыле. У дарозе стрэльба паліцыянта неяк выпаліла і забіла кабылу Бельмача. Аб гэтым быў напісаны пратакол, пасьля чаго паліцыянта Кондака Суд Пакою ў Баранавічах наказаў 7-мю днямі арышту. Дык у зьвязку з гэтым пацярпеўшы Бельмач зьвярнуўся да Баранавіцкага старасты з паданьнем, каб яму паліцыі ці староства, каторае мела паліцыянта, не ўмеўшага трымаць у руках стрэльбу, выплаціла 700 — 1000 злотых за забітую кабылу. Адказу на гэта доўга ня было, а нарэшце староства ў Баранавічах прыслала паперку, каб Бельмач злажыў скаргу ў суд у Ляхавічах... Чаму туды? Прычым вінаваты пастарунковы Кондак некуды зьнік, ці, як кажуць, перавялі, каб на вочах ня быў, але куды, Бельмач і дагэтуль ня можа нідзе даведацца. Пісаў ён некалькі просьб да Міністэрства, Староства і г. д., але ўсюды адно — bez uwzględnienia, ня гледзячы на тое, што Найвышэйшы Трыбунал у гэткіх выпадках наказвае выплату адшкадаваньня... Па віне адміністрацыі Бельмач упусьціў і 6-месячны тэрмін для падачы ў суд проціў „казны". А Кондак далей дзесь служыць, але гдзе — гэта тайна! Вось, аб падобных выпадках трэба было-б ведаць, а ня іграць у „рэгіяналізм", бо калі такія справы будуць залатвяцца гэтак, як дасюль, дык... дужа на гэтым заробяць „jedynkaczy".

Гдзе-ж праўда? І чаму гэта ўлада ня можа заплаціць бедняку за кабылу 700 злотых, а потым сьцягнуць хаця-б з паліцыянта, каторы служыць нягдзе ў Нясьвіжскім павеце?

Чаму? А таму — адкажам, — што „нашыя" дзеячы, бавяцца ў „рэгіяналізм" ці ў „адзінку", думаючы, што яны сваей „панскай хлусьнёй" нешта зробяць і некага прыцягнуць на свой бок... **А. Б.**

На шляху здрады.

(М-ка Ярэмічы, Стаўпецкага пав.).

Ярэміцкая моладзь — гэта ахвяра барацьбы за вызваленьне беларускага працоўнага народу... Усе лепшыя сілы з нечалавечаю жорсткасьцю неміласэрдна зьнішчаны.

Карыстаючы з такога „адпаведнага мамэнту", нашыя „пераможцы" тых хлапцоў, якія яшчэ засталіся, пастанавілі накіраваць на шлях здрады, здрады працоўнаму народу.

З гэтай мэтай у нашым мястэчку „арганізавалася" гэтак званае „коло драматыч

нэ", якое мелася захапіць у чужацкія рукі нашу моладзь.

Гэтая справа была сьпярша даручана польскаму вучыцелю Гумінскаму. Але гэты небарак у часе выбараў, як кажуць, „марку сапсаваў", дык яго і слухаць ніхто не хацеў. Тагды бярэцца другі „кандыдат" — Цытэвіч. Пачаў ён з абяцанак. Так і так, будзе тое і тое, атрымаем запамогу і г. д., і г. д. А напуль-што... да пана Гіршоўскага на халоднае піўцо. Хлапцом спадабалася, але невядома што: ці арганізацыя, ці халоднае піўцо?

Што-ж нарабіліся некаторыя нашыя хлопцы начальнікамі „zarządu" і пачалі „прадаваць". Паставілі адзін спэктакль, дык на буфэце з 45°/₀ зарабілі мінус 40 зл., на другім-жа што было, дык іх кіраўнік „прыгарнуў". Невядома, як далей было-б, але назначылі рэпэтыцыю на трэйці спэктакль. Але пан Цытэвіч замест у „культурнае" драматычнае „кола", напаў да пана Гіршоўскага, дзе дзёргаў цэлую ноч на „шосу 45°/₀".

І вось, прыйшла драма на „драматычнае кола": яно, як гнілы пень, развалілася.

Хлопцы, якіх заманулі ў гэтую „арганізацыю", здрадзілі свайму народу, які запраўды імкнецца да асьветы і культуры.

Але ня ўсе такія. Верная моладзь пад кіраўніцтвам беларускіх гімназістаў арганізавалі Гурток Т-ва Бел. Школы, які ўзяўся за культурную працу.

Чэсьць ім! Уся моладзь уступіць у іх рады!

Дзядзька Габрусь.

Ці не пара прачнуцца?

(Пружаншчына, М. Шарашова).

Шырока і прывольна разляглося м. Шарашова... Зусім, як павятовы гарадок... Мае брукаваныя вуліцы, адзін касьцёл, дзьве царкві, жыдоўскі банк, жыдоўскую бібліятэку-чытальню, жыдоўскія крамы і... дзьве рэстаўрацыі „z wyszynkiem napojów wyskokowych"; ёсьць і школа, але... польская, навет арганізацыя „młodzieży"—шляхотны „Strzelec". З усяго гэтага можна падумаць, што Шарашова знаходзіцца дзе небудзь у „Kongresówce" — запраўды залюднена выключна зямляробамі-беларусамі, апрача некалькіх ўрадоўцаў і жыдоў.

Калі-ж там беларусы, то дзе-ж арганізацыі культурныя і інш.? Чым займаецца Шарашоўская моладзь у сьвята, у даўгія зімовыя вечары? Ці няма моладзі зусім?—Спытаецца не адзін. Вось гэта і сумна, што ёсьць і моладзь, ёсьць і „сьвядомыя" жыхары... Але сьпяць мяртвяцкім сном. Прыдзе сьвята.,. „Сьвядомыя" жыхары зыйдуцца, пагутараць аб тым, аб гэтым. „Эх"! скажа і пазяхне Гоп-ук. „Эх"! пасобіць яму пазяхнуці Чы-рка. А хлопцы зыйдуцца на рагу вуліцы, каля ліхтарні і дзівяцца, як прахаджаюцца дзяўчаты, паказваюць пальцамі на вясковых хлопцаў, што ня так убраны, як яны і... сьмяюцца. Гэтак пройдзе „день ды ночь і суткі прочь". Але ці не пара шарашоўцы, ўзварухнуцца? Ці не пара ўзяцца за асьветную працу, залажыць бібліятэку-чытальню? Няхай вясковыя „хамы", прыйшоўшы ў сьвята да Шарашова, зайдуць туды, пасядзяць, пачытаюць газэты, пагутараць, зыйшоўшыся з некалькіх вёсак, аб лепшым жыцьці, аб супольнай працы на культ.-асьветным полі, замест, каб прыйшоўшы, прапіваць апошнія грошы ў рэстаўрацыях. Шарашоўцы!—досыць гэтага! Пара залажыць Гурток Т-ва Бел. Школы ды наладзіць свой, беларускі спэктакль. Ачнецеся! Не адставайце ад другіх! Вас шмат, а дзе шмат робіць, то многа зробіць!

„Сумуючы".

Ахвяры цемры.

2-га ліпня што год бывае ў м-ку Будславе, Вялейскага павету, сьвята—фэст. У гэты дзень тут ёсьць сотні ахвяр цемры. Крукам касьцёла хворыя людзі паўзаюць бокам, ракам (ахвяраваўшыся гэтак зрабіць, каб выздаравець). У касьцёл нясуць апошнія кусні палатна, апошнія фрукты вобны і г. д., маючы на ўвазе, што Бог ім за гэта адудзячыць — дасць здароўя ім, іхнім дзеткам і г. д... Значыць, лечацца.

Шмат цёмных людзей, дзякуючы гэткаму лячэньню, прычэпленаму праз клір — „бацю" „войчынкаў", уміраюць без пары!

Ч.

Новы вучыцель.

(Горадня).

На тэрэне Горадні ёсьць тып пад імем Г. Злоцкі.

Прошласьць гэтае асобы цёмная, як тая вада ў вабляках. Сам паходзіць з Скідзельскае гміны. Як перадае Фама — гэта „дзеяч"—быў у арміі Юдзеніча ў контррэвалюцыі, потым прымазаўся да эсэраў, а ў 1921 г. быў у Менску „чэкістам", з прыехаўшы ў Польшчу, стаў „вялікім дзеячам" і навязаў кантакт з Савінковым. Служыў канфідэнтам у II аддзеле Ген. Штабу, а потым у Беластоцкай паліцыі, як „Бялоў-Немчыновіч".

Уся яго работа зводзілася да таго, каб пісаць розныя гатунку даносы ў дэфэнзыву і правакаваць пасобных грамадзкіх работнікаў. Ён зьвязаўся галоўным сьведкам у Беластоцкім працэсе у 1923 г. процi б. пасла С. Барана, на якога пісаў даносы ў дэфэнзыву і даў рэляцыі—нібы С. Баран, калі будзе незалежная Беларусь, будзе вызначаны Ваяводаю ў Горадні, і іншых розных правакатарскіх зьместу заяў.

Цяпер гэты тып „за вернаю службу" быў камандзіраваны ў Кракаў на вучыцельскія курсы і ў хуткім часе будзе „kształcić" нашу моладзь.

Трэба, каб кожны ведаў аб падобным тыпе.

Нядоля.

„Навука" ў польскай школе.

(В. Лядкі, Ярэміцкая гм., Стаўпецкі пав.).

Як нашых дзетак „навучаюць" „патанчыкі", хіба ўсім ужо вядома, але не зашкодзіць яшчэ адзін абразок.

Наш польскі вучыцель вучыць ні папольску ні пабеларуску, а толькі конікі лупіць ды пад ногу сьвістаць. Затое добра карае, засаджваючы на 4 — 5 сьвяточных дзён „do kozy". Калі-ж дзіця ня прыйдзе да „школы", дык бацьку караюць на 5 зл. штрафу або 1 — 2 дні арэшту.

Апроч таго, гэты вучыцель мае шмат „надужыцьцяў" і „дэфраўдацыяў", за што яго навет падавалі на суд, з якога, аднак, выйшаў „чыста". Але нябось, няхай хто з нашых сярмяжнікаў пападзецца, то не пашкадуюць гадкоў 3 — 4, або навет і 12.

Дзядзька Габрусь.

З Т-ва Бел. Школы.

Акружны зьезд Т-ва Беларускае Школы ў Горадні.

12 ліпня с. г. адбыліся перавыбары Гарадзенскай Акружнай Управы Т-ва Бел. Шк. На зьезд прыбылі прадстаўнікі ад гурткоў Т-ва Бел. Шк. Горадзенскага павету. На тварах прыбыўшых ясна можна было прачытаць адбітак тых прыкрых перажываньняў, якія пакінулі па сабе выбары да Сойму. Нічым не заслужаная няміласьць з боку мяйсцовых уладаў, як гаць стрымала воду, стрымала роскві̇т культурна-адраджэнскае працы ў Горадзеншчыне. Гэтыя поўныя веры, поўныя гарачай энэргіі маладыя барацьбіты на ніве культурнай ня ўпалі духам, не падаліся адчаю, што можна было бачыць з далейшага цягу зьезду, наадварот—несправядлівае тасаваньне рэпрэсіяў дадало сілаў у змаганьні за родную асьвету; сталёвым гартам узмоцніла грудзі змагароў, цьверда верачых, што які-б ня быў цярністы гэты сьвяты шлях да шчасьця, да лепшае будучыні, мы будзем ісьці па ім, выбівацца з адвечнае цямноты да сонца, да сьвятлом зьзяючых праменістых зораў шчасьця.

Зьезд адчыніў Старшыня Т-ва А. Уласаў, які, прывітаўшы ад імя Галоўнае Управы прысутных, даў поўную характарыстыку агульнае культурна-асьветнае справы, як у замежных дзяржавах, так і ў нас, у Заходняй Беларусі.

Ад Горадзенскай Акружнай Управы даклад аб працы Т-ва робіць гр. Сяўрук. Досіць яскрава высьвятліўшы, як арганізацыйную, так і культурна-асьветную працу гурткоў, грам. Сяўрук зазначыў, што ёсьць шмат перашкодаў, па той ці іншай прычыне, на шляху да поўнага развою нашай арганізацыі. Ня можна не зрабіць закіду дакладчыку, які як былі Старшыня Горадзенскае Акруж. Управы, робіць памылковы вывад, што трудна вясьці ў такіх рамках працу, калі людзі, паміма справы культурнай, цікавяцца яшчэ шмат чым... Абставіны жыцьця, гэты бурлівы вадаварот яго, дае права кожнаму грамадзяніну мець пэўную орыентацыю ў ва ўсебаковых паглядах на жыцьцё і ня можна ніколі абмяжоўваць свой сьветапагляд выключна ў межах культурнага усьведамленьня.

Далей па чарзе ідуць даклады з мейсц. Выносіцца агульнае уражаньне, як цьверда з непарушнаю вераю ў свае сілы гэтыя сыны вёскі ідуць да свае сьвятое мэты, ня гледзячы на ўсё перашкоды, на ўсе прыкрасьці на гэтым ідэйным шляху, якія асабліва далі сябе балюча адчуць у апошнія пасьля—выбарчае часы. Пасьля дакладаў з мейсц даецца слова інструктару ад Галоўнае Управы Т-ва Бел. Шк. грам. Шырме. Колькі бадзёрнасьці, колькі заахвочваньня да працы чуецца ў гэтах шчырых славах перадавога змагара на ніве культурнай. Толькі ахвярная праца, якой мы павінны аддацца ўсёю душою, кажа грам. Шырма, дасьць нам рэальныя вынікі. Трэба сабе ясна ўявіць, што значыць гэтае вялікае слова Родная Школа. Толькі праз родную школу, праз навуку ў роднай мове мы можам здабыць для сябе тыя падставы, якія дапамогуць нам выйсьці на сусьветны вялікі шлях народаў; чужая-ж школа патрабуе іншых высілкаў. Не павінны мы, кажа далей гр. Шырма, паддавацца ў крытычны момант, адчаю. Культурная справа ў агульным маштабе досіць значна пашыраецца. Часамі ёсьць запутаньні працы, гэта выясьняецца тым, што сябры недакладна ведаюць, на чым палягае плян працы на гэта трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. Брак інтэлегэнцыі ў даным выпадку балюча адчуваецца, але вялікія высілкі даюць вынікі прыёмныя. У гарачых словах грам. Шырма тлумачыў, на колькі важнае для нас і пазашкольнае пытаньне. Пасьля сусьветнай завірухі моладзь, выкінутая за парог школы, засталася здэмаралізаванай. Духовае падняцьце маладога пакаленьня, — галоўнае заданьне Т-ва. І ўва ўсім гэтым к нам ідзе з дапамогай, як верны наш жыцьцёвы сябра, кніжка. Заданьнем Т-ва Бел. Шк. — паглыбіць сьветапагляд, духовае развіцьцё ў людзей. Навука-кніжка ёсьць пэўным памоцнікам нам на гэтым адраджэнскім шляху да нашае сьвятое будучыні. Далей ў чарговым парадку адбыліся перавыбары Акружнай Управы, у склад якой ўвайшлі наступныя асобы: Міхась Косьцевіч, як старшыня, Надзея Ламашэвічанка—віцэ старшыней, сэкрэтар Язэп Шышлюк, яго заступнік М. Кізевіч і скарбнік Піліп Кізевіч.

У бягучых справах, грам. Уласаў зазначыў аб неабходнасьці арганізаваньня ў Вільні дзесяці-дневых курсаў, для будучых інструктараў-гурткоў Т-ва Бел. Школы, якія-б стараліся праводзіць у жыцьцё заданьні нашай культурна-асьветнай арганізацыі. Адначасна прамоўца падае да ведама аб маючай адбыцца ў Вільні ў м цы кастрычніку беларускай выстаўцы, заклікаючы сход прыняць чынны ўдзел у гэтым, прысыланьнем арыгіналаў, модэляў і розных рэчаў, якія ўжываюцца на беларускай вёсцы. На заканчэньне зьезду паліліся гукі песьні, створанай праснуўшымся ад векавечнага рабскага сну Беларускім Народам:

„Ад веку мы спалі і нас разбудзілі"...

Прысутны сябра.

Праца Гурткоў Т-ва Белар. Школы.

× 8. VII. і 22. VII. с. г. Караніпчацкі Гурток Т-ва Бел. Школы, Вялейскага павету зладзіў у вёсцы Каранішчах спэктаклі.

8. VII было пастаўлена: „Сурдут і Сярмяга"—драма ў 3 актах Гутоўскага і „Пасланец"—Жарт у 1 акце Л. Родзевіча. 22. VII. было пастаўлена: „Апошняе Спатканьне" — драма ў 4 актах. Ул. Галубка і дэклямацыя: „Будзь сьмелым" — верш Я. Купалы, „Хто адрокся свайго"—верш Г. Леўчыка, „Гусі"—верш Я. Коласа.

Чысты даход ад абодвых спэктакляў пашоў на куль.-асьветныя мэты Т-ва Бел. Школы.

Сэкрэтар Гуртка Пл. Грышкевіч.

Усячына.

× Лодзкая работніца Станіслава Сэнк радзіла дзіця, зусім пазбаўленае галавы. Труп аддаты ў Касу Хворых для перадачы ў паталягічную калекцыю.

× У Люблінпчыне ў вёсцы Людыч, у аднаго гаспадара карова прывяла цяля, маючае сабачую галаву, мызу і вушы. На пярэдніх лапатках вырастаюць нарасьці ў форме крыльляў. Заднія ногі сьвіныя, хвост падобны да сабачага, пакрыты густой шэрсьцю.

Натуральна, што на гэтае дзіва прыходзіць падзівіцца шмат народу.

Што часам выраблюць нашы „айцы духоўныя"!

Пад зусім нявінным загалоўкам: „Трагедія нещасної Люні" (пабачыце, які гэта будзе „любоўны раманс"!) у вульгарна-сэнсацыйнай форме, „Новий Час", орган „Ундо" (украінская арганізацыя, пакрэўная нашым сельсаюзьнічкам) з дня 9. VII. № 82 падае наступнае, на наш погляд, агіднае здарэньне.

„Айцец" Пётр Агрызка, Бушковіцкага прыходу, засумаваў моцна па кабеце (гэта ж толькі і ў думках таму, які нічога ня робіць!), бо ж, бачыце, яго жонка за якуюсь правінку адбывае доўгую кару ў турме (пэўне ж не за палітыку!). Блізка не знайшоў, мусіць, такой „лагоднай", якая згадзілася-б падзяляць і красіць адзіноцтва „айца" Пятра. Дык ён надумаў падаць у Луцкую газэту агалошаньне ад імя Івана Бандарука, што быццам патрабуе вучыцелькі да свайго дзяцёнка. На гэта адгукнулася бедная 23-гадовая дзяўчына, якая не магла скончыць сэмінарыі, бо ж бацькі, пражываючы ў м. Стрыю, ня мелі больш сродкаў. Напісала ліст. Варункі прапануе добрыя, прыслаў на дарогу грошы. Паехала. Змучаная падарожжам, зайшла па адрасу да папа, пытае.

— Ці тут жыве Бандарук?

— Тут, тут, але ён ня хутка прыйдзе—ляж, доч мая, адпачні!—запрапанаваў гасьцінны поп.

Нічога ня ведаючы, сэмінарыстка згадзілася, але, калі ўжо лягла, дык і „айцец", пазамыкаўшы дзьверы, палез у „кумпанію". Нічога не памаглі сьлёзы і просьбы няшчаснай, поп такі выканаў свой „хрысьціянскі" абавязак. У працягу дзевяці дзён, ад 13-га да 22-га траўня, попік запёршы, зьдзекаваўся над сваей ахвярай. Але, калі ўжо нацешыўся ў волю, стаў падумываць, як-бы яе пазбавіцца, ды не сьцягнуць на сябе адказнасьці. Напісаў нібы дабравольную ўмову:

— Я сьвяшчэньнік П. Агрызко, парахвіі в. Бушковічы, Гарохаўскага павету, абавязуюся заплаціць адшкадаваньне за тое, што я пад фальшывым прозьвішчам зьвёў паненку-вучыцяльку..., 250 даляраў—і даў навет задатку 800 зл., а на астачу выдаў вэксэль.

Тымчасам, ад усяго перанесенага дзяўчына расхварэлася і зьлягла. Тагды поп украў назад і грошы і дакуманты свае ахвяры, а яе стаў выдаваць за нейкую прыблуду, якую ён з „літасьці" прыняў і вось лечыць. Заявіў на пастарунак і трэбаваў, каб яе адаслалі, куды трэба. Але на пастарунку ня надта сьпяшаліся спаўніць просьбу папа, (гэта-ж ня грамадаўка там нейкая!), а яму канешна хацелася скарэй выпіхнуць „бяду" са сваей хаты.

Поп нагаварыў селяніна Янку Лёсьніка, пэўне-ж сказаўшы пропаведзь аб „любві к ближняму", і той забраў хворую да сябе. Ачуняўшы, яна паехала да бацькоў у Стрый, каб выбраць новыя дакуманты і спакінуўшы бацьком сваю фатаграфію з надпісам „на ціхій спамін ад няшчаснай Люні" — выехала.

Цераз месяца паўтара, дзяўчына пачула ў саба пасьледкі папоўскай „любові", не змагла перанясьці гэтае ганьбы, пакончыла сваё жыцьцё, выпіўшы воцтавай эсэнцыі.

Так „айцец духоўны" і „збавіў" адну душаньку, толькі вось... ня грэшную, а зусім нявінную!

Бацькі пакіравалі справу ў суд, але, ня ведаю, ці прызнаюць віноўным папа Агрызку, а калі і прызнаюць, дык ня вельмі строга пакараюць. Глупства, ці ж мала бедных дзяўчат ёсьць на сьвеце!

Як з ураджаем?

Хоць мала, але атрымалі мы некаторыя весткі аб ураджаі. Вось, што нам пішуць з Пружаншчыны.

„Праз увесь час няма дажджоў, трава, супраць леташняга, урадзіла ўдвая менш, сена нарабілі зусім мала. Вясьняныя пасевы, як бульба, выпякаецца сонцам. 5-га ліпня прайшоў вялікі вецер, які нёс цэлую хмару зямлі, пазьдзіраў стрэхі з будынкаў. У вёсцы Ялавой, Сухапольскай вол., параскідаў шмат стагоў сена, як сухога, так і сьвежаскошанага паразносіў за некалькі кілямэтраў.

Як бачым, вестка „незавідная". Ня тое атрымалі з Вялюжскага пав., Лодзкага ваяводзтва, г. зн. з каранной Польшчы.

„У Вялюжскім павеце ўраджай зімовых пасеваў вельмі добры. Яравыя, дзеля сушы—горшыя, бульба на пяскох пад вечар вяне".

Ад Віленскае Беларускае Гімназіі.

На падставе атрыманых распараджэньняў, прыймо ў Гімназію новых вучняў можа адбыцца ўвосені толькі з дазволу Кураторыуму. Усе просьбы адрэсуюцца на імя Кураторыуму Віленскага Школьнага Вокругу, але прысылаць іх, разам з дакумэнтамі, трэба **ў Дырэкцыю Гімназіі і не пазьней 10 жніўня г. г.**

Хто перарос вымаганую норму, той ня можа быць прынятым у Гімназію. У I кл. прыймаюцца ад 9½ да 12 гадоў, у II ад 10½ да 13 гадоў, у III ад 11½ да 14 г. і г. д.

У інтэрнат пры Гімназіі будуць прыймацца толькі хлапцы **малодшых клясаў** (I—IV кл.) з платаю за ўтрыманьне ад 50 да 60 зл. у месяц, пры сваім адзеньні і бялізьне. (Гэта не адносіцца да стыпэндыятаў).

За падробнымі спраўкамі зварочвацца ў Канцылярыю Гімназіі.

Дырэкцыя.

Ад Радашкоўскае Белар. Гімназіі.

Даводзіцца да агульнага ведама, што прыймо вучняў у Радашкаўскую Гімназію адчынена ў-ва ўсе 8 клясаў.

На падставе атрыманых загадаў, да ўступных экзаменаў жадаючыя будуць дапушчацца толькі з дазволу Кураторыуму Віленскага Школьнага Вокругу.

Усе просьбы аб дапушчэньні да экзаменаў ці залічэньні вучнем павінны адрэсавацца на імя Кураторыуму і прысылацца разам з дакумантамі (мэтрыка і аб папярэдняй адукацыі) ў Дырэкцыю Гімназіі не пазьней 10 жніўня г. г.

Адрэс: m. Radoszkowicze, pow. Mołodeczno.

Дырэкцыя.

Высылаючы рахункі, просім усіх нашых П. Гр. Падпісчыкаў у як найхутчэйшым часе ўрэгуляваць падпісную плату, каб ня змусіць нас спыніць высылку газэты.

Адміністрацыя.

Палярная трагедыя.

Няшчасная падарожа італьянскага генэрала Нобіле на паўночны полюс. Палярныя экспэдыцыі даўней і цяпер. Ганьба фашыстаўскай „навуковай“ экспэдыцыі. Слава радавай ратунковай экспэдыцыі.

Увесь культурны сьвет з напружаньнем сьлядзіць за тэй трагедыяй, якая больш двох месяцаў разыгрываецца далёка ад нас, — на паўночным моры. Галоўнай фігурай гэтай трагедыі ёсьць італьянскі генэрал — Нобіле. Прозьвішча Нобіле вядома сьвету ад 1926 году, як учасьніка навуковай падарожы на паўночны полюс пад загадам і галоўным кіраўніцтвам слаўнага нарвежскага вучонага і падарожніка Амундсэна. Амундсэн тагды на паветраным караблі (дырыжаблі) „Нарвэгія“ шчасьліва даляцеў да самага паўночнага полюсу, абкружыў яго некалькі разоў, зрабіў належныя памеры і фатаграфічныя зьнімкі і таксама шчасьліва вярнуўся назад. Гэта падарожа Амундсэна праславіла яго на ўвесь сьвет, бо Амундсэн першы адкрыў заслону з тэй таямніцы, якая акрывала сабой сотні тысяч гадоў паўночны полюс.

Многа было сьмельчакоў, якія першыя хацелі стаць цьвёрдай нагой на тыя землі, на якіх яшчэ ніколі ня ступала нага чалавека. Маніла іх туды адных—ахвота веды, другіх—пагоня за славай, багацьцем, або прыгодамі.

Першым, хто распачаў небясьпечную падарожу на паўночны полюс, быў ангельскі капітан Джон Франклін, які ў 1845 годзе, на двох парусных караблях разам з экспэдыцыяй, адплыў у Паўночны Ледавы акіян. Праз пару месяцаў Франклін даваў весткі аб сабе, але пасьля ўсякія чуткі аб ім загінулі. І толькі праз дзевяць гадоў рыбаловы знайшлі часткі вопраткі і іншых рэчаў, бязумоўна належачых да нешчасьлівай экспэдыцыі Франкліна. Пасьля гэтай экспэдыцыі, у 1881 г. амэрыканскі паручык Грэлей на паравым караблі выплыў да паўночнага полюсу. Даплыць, аднак, да намечанай мэты яму не ўдалося,—карабель яго затрымаўся паміж вялікіх ледавых гораў і ня мог ісьці ні наперад, ні ўзад. Грэлей з таварышамі кінуў тагды карабель і пехатой на крыгах пачаў ратавацца назад. Большая часьць яго таварышоў загінула ў цяжкай дарозе і толькі пяцёх, на чале з Грэлем, праз два гады шчасьліва дабраліся да ратаўнічага амэрыканскага карабля. Праз гадоў дзесяць пасьля, шведзкі вучоны Андрэ загадаў зрабіць вялікі паветраны балён, належна дапасаваны да далёкай паўночнай падарожы і на гэтым балёне выляцеў на паўночны полюс. Пры помачы паштовых галубоў даваў ён весткі аб сабе, але хутка ня стала ніякіх вестак і балён з адважнымі падарожнікамі загінуў назаўсёды. Пасьля гэтага, у працягу прыблізна трыццацёх гадоў ня было ніякіх падарожаў на паўночны полюс. Здавалася, што сіла і энэргія чалавека павінны былі пакарыцца перад магутнай прыроднай стыхіяй. Аднак, сучасная веда і тэхніка ў руках адукаванага, сільнага воляй і цярплівага чалавека аканчальна заваёўвае прыроду. Гэта ўласьне дадало адвагі слаўнаму нарвэжскаму вучонаму Амундсэну зноў, па стольких няўдалых спробах яго папярэднікаў, распачаць адважную падарожу на паўночны полюс. 21 траўня 1925 г. Амундсэн, у таварыстве шасьцёх іншых вучоных, на двох летаках пачаў гэту небясьпечную падарожу. Летакі доўга змагаліся з паўночнымі віхурамі і сьнежнымі завеямі. Далей аказалася, што ляцець немагчыма. Летакі прымушаны былі асесьці на ледзяных крыгах у адлегласьці ўсяго 136 кілямэтраў ад намечанай мэты — г. зн. ад самага паўночнага полюсу. Праз два дні ўдалося ім падняцца ў паветра і адляцець назад. Такім чынам Амундсэн першы даляцеў так далёка на поўнач, дзе яшчэ ніколі ня было сьледу чалавека. Лётам сваім Амундсэн даказаў усяму сьвету, якія вялікія дасягненьні зрабілі сучасная веда і тэхніка. Аднак, каб даляць да самага паўночнага полюсу і зрабіць там належныя навуковыя досьледы, належыць магчыма даўжэйшы час затрымацца над ім, а дзеля гэтага, аэраплян, як тэхнічная прылада, яшчэ заслабы.

Амундсэн тагды пачаў сьпешна рыхтавацца да паўторнай экспэдыцыі на паўночны полюс. Дзеля гэтай мэты загадаў зрабіць вялікі паветраны карабель (дырыжабль) „Нарвэгія“. На гэтым караблі Амундсэн 12-га траўня 1926 года пераляцеў праз самы паўночны полюс і зрабіў, як ужо вышэй успомнена, вялікай вагі досьледы. Папярэдзіў Амундсэна амэрыканскі лятун, капітан Бырд, які за два дні перад Амундсэнам на аэраплянe пераляцеў паўночны полюс. Як Амундсэн, так і Бырд сцьвердзілі, што на самым паўночным полюсе ніякай зямлі няма, а ёсьць толькі мора, па якім плылі вялікія ледзяныя крыгі.

У гэтай апошняй экспэдыцыі Амундсэна таварышыў яму, паміж іншымі, і італьянскі (тагды) палкоўнік Нобіле. Як характарыстыку гэтага фашыстаўскага ваякі, газэты падаюць, што ён у часе найбольшай небясьпекі, вельмі палахліва і маладушна захоўваўся, нападаючы на Амундсэна з рознымі наракамьнямі. Па павароце ў Італію, Нобіле стараўся выстаўляць сябе, як вялікага і адважнага падарожніка, засланяючы сабой слаўнага Амундсэна. Пышлівыя фашысты рабілі яму каралеўскія авацыі, а Мусоліні нагарадзіў яго чынам генэрала. Аднак, апінія ўсяго сьвету слушна ацаніла заслугі Амундсэна. Слава аб ім разыйшлася па ўсім сьвеце. Нобіле, як і трэба было спадзявацца, застаўся ў цені.

Амбіцыя і жаданьне славы не давалі спакою фашыстаўскаму генаралу. Нобіле захацеў сам на чале выправы паляцець на полюс. Мусоліні падтрымаў яго думку, бо і яму хацелася праславіць свой фашызм. Вызваны былі ў Італію нямецкія інжынэры, якія збудавалі вялікі паветраны карабель, падобны да Амундсэнавага. Фашысты ахрысьцілі яго „Італія“. Перад выправай Нобіле атрымаў ад Мусаліняга італьянскі нацыянальны сьцяг, а папа рымскі даў вялізны сталёвы крыж, якія павінны былі быць выкінуты з карабля на самы паўночны полюс.—Мела гэта значыць як-бы сымбал панаваньня фашыстаўскай Італіі і каталіцкага крыжу над усім сьветам.

У палове красавіка с. г. „Італія“ вырушыла ў падарожу. На ёй было, апрача Нобіле, 18 чалавек залогі, паміж якімі было двох прафэсараў—шведзкі Мальгрэн і чэскі Бегунэк.

Самы пачатак падарожы „Італіі“ пачаўся фатальна. Пралятаючы праз Нямеччыну, Нобіле заблудзіўся ўначы, доўга кружыўся на адным месцы, аж нарэшце павінен быў спусьціцца на зямлю, зрабіўшы пры тым паважныя ўшкоджаньні свайго дырыжаблю, на рапараваньне якога спатрэбілася некалькі дзён.—Гэта было як-бы знакам асьцярагаўчым перад катастрофай.

Даляцеўшы да Паўночнага мора, Нобіле затрымаўся на аднэй з няведамых арктычных выспаў, скуль рабіў некалькі невялікіх разьведачных лётаў. Пасьля зноў вярнуўся на Шпіцбэрг і стуль 23 га траўня выляцеў на паўночны полюс. Таварышы падарожы папераджалі Нобіле ўстрымаць лёт яшчэ на некалькі дзён з прычыны няспрыяючых атмасфэрычных варункаў, але Нобіле ўпорна стаяў на сваім. Хадзіла яму, як падавалі газэты, „канешне“ даляцець да паўночнага полюсу ў дзень 24-га траўня,—г. зн. у дзень нейкага фашыстаўскага сьвята, каб азнаменаваць гэта сьвята скіненьнем італьянскага сьцягу.

Па дваццацёх гадзінах лёту надыйшла з „Італіі“ радыё-тэлеграма, што Нобіле знаходзіцца над самым паўночным полюсам, дзе скінуў італьянскі сьцяг і ахвяраваны рымскім папай крыж. А на другі дзень прыйшла тэлеграма, што дырыжабль „Італія“, варочваючыся назад, пацярпеў катастрофу. На ратунак разьбіткам пасьпяшылі экспэдыцыі з Нарвэгіі, Швэцыі, Радавага Саюзу, Фінляндыі і Францыі. На караблях, на аэраплянах, на санках, запрэжаных сабакамі, сьпяшыла помач, але сільныя вятры, сьнежныя завеі, густая імгла і маразы стаялі на перашкодзе.

Радавы Саюз выслаў два свае найлепшыя ў сьвеце крыгаломы — „Красін“ і „Малыгін“, а таксама аэрапляны з найлепшымі сваімі лятунамі—Бабушкіным і Чухноўскім. Экспэдыцыя гэта знаходзіцца пад кіраўніцтвам вядомага радавага вучонага праф. Самайловіча.

На ратунак таксама пасьпяшыў на аэрапляне Амундсэн.

Падарожа ратунковых экспэдыцыяў аказалася ня менш цяжкая, а навет больш небясьпечная, чым падарожа самога Нобіле. Шмат з ратаўнікоў загінулі, а ў тым ліку і слаўны Амундсэн, аб якім да гэтай пары няма ніякіх вестак. Пасьля цяжкай працы ўдалося лятунам адшукаць першую групу разьбіткаў на чале з Нобіле. Шведзкі лятун Люндбэрг апусьціўся каля іх, але забраць мог на аэраплян толькі аднаго чалавека; быў ім сам генэрал Нобіле. Хоць Нобіле запраўды быў хворы і меў зламаную нагу, але ратавацца яму першаму не выпадала;—добры капітан карабля заўсёды павінен больш думаць аб людзёх, жыцьцё якіх узяў на адказнасьць свайго сумленьня, павінен ратаваць іх ад небясьпекі, а самому ратавацца, калі ёсьць магчымасьць, апошнім. Але ў фашыстаўскага генэрала ёсьць свая этыка. Ня гледзячы на безнадзейны стан сваіх таварышоў, ня гледзячы на тое, што з пасярод іх ёсьць большасьць хворых і цяжка пакалечаных, Нобіле кідае іх, аддаючы амаль на пэўную сьмерць; ён ратуе сваё „генэральскае“ жыцьцё!

У той час, як Нобіле ўратаваўся, людзі, якія самаахвярна пасьпяшылі яму і яго экспэдыцыі на ратунак, кінуліся змагацца з паўночнай стыхіяй, выстаўляючы сваё жыцьцё на вялікую небясьпеку. Гэтак, выбаўца Нобіле, лятун Люндбэрг, ратуючы іншых разьбіткаў, перавернуўся з аэраплянам на лёдзе, разьбіў аэраплян, але сам шчасьліва астаўся жыў. Выратаваў яго ад сьмерці радавы крыгалом „Красін“.

У ратаваньні разьбіткаў, найбольш праславілася радавая ратунковая экспэдыцыя. Больш месяца радавыя крыгаломы прабіваліся праз таўшчэзныя горы лёду, ломячы іх на сваёй дарозе. Здавалася, што высілкі іх дарэмныя, што ім не адалець вялікіх перашкодаў, аднак, сільная воля і самаахвярнасьць пхалі іх наперад туды, дзе чакалі іх дзьве магчымасьці: — выратаваць няшчасных, або зьгінуць самім!... Высланы на помач радавы лятун Бабушкін пяць дзён змагаўся ў паветры з віхурамі і сьнежнымі завеямі. Усе лічылі яго прапаўшым, аж, нарэшце, удалося яму даляцець да свайго крыгалому „Малыгіна“. Другі радавы лятун Чухноўскі (украінец) адшукаў дзьве групы разьбіткаў, прабыўшы такосам пяць дзён у паветры. Шукаючы свайго крыгалому, ён змушаны быў апусьціцца з аэраплянам на ледзяную крыгу. Калі яго паведамілі па радыё, што крыгалом „Красін“ ідзе яму на помач, ён адказаў: **„перш ратуйце разьбіткаў, а пасьля, калі ўдасцца, мяне“.**

Пасоўваючыся наперад, крыгалом „Красін“ даваў сыгналы. Была густая цёмная імгла, так што нічога навакол ня было відаць. Пачуўшы сыгналы, разьбіткі распалілі вялікі вагонь, які быў заўважаны на „Красіне“. Падыйшоўшы блізка, часьць залогі „Красіна“ з капітанам на чале зыйшла на крыгу, перанясла разьбіткаў на крыгалом, а пасьля іх рэчы, а навет разьбіты аэраплян Люндбэрга. Убачыўшы ратунак, разьбіткі плакалі ад шчасьця, дзякавалі радавай камандзе за самаахвярную помач і цалавалі іх. У ліку 11 выратаваных „Красіным“ разьбіткаў, знаходзіцца і чэскі вучоны, праф. Бегунэк. Пасьля гэтага „Красін“ уратаваў свайго лятуна Чухноўскага.

Радавая ратунковая экспэдыцыя атрымала шмат тэлеграмаў павіншаваньняў з усяго сьвету, як удзячнасьць за нясеньне помачы няшчасным, а таксама загад ад свайго ўраду з Масквы, прадаўжаць далей пашуківаньні. Пасьля направы ўшкоджаньняў, якіх дазнаў „Красін“ у небясьпечнай падарожы, экспэдыцыя зноў вырушыць у дарогу, шукаючы загінуўшай групы Аляксандрі, разам з якой спадзяюцца знайсьці і Амундсэна, аб якіх да гэтай пары няма ніякіх вестак. На помач ім радавы ўрад выслаў трэцьці крыгалом „Седов“.

Газэты ўсяго сьвету адзначаюць геройства радавай ратунковай экспэдыцыі і абураюцца на Нобіле і яго фашыстаўскіх таварышаў за тое, што неадпаведна прыгатавалі адправу і сталіся праз гэта прычынай сьмерці таварышаў. Што Нобіле меў толькі адну мэту — у дзень фашыстаўскага сьвята заткнуць італьянскі сьцяг і рымскага папы крыж на паўночным полюсе. За гэта „геройства“ і паплаціўся катастрофай, а калі ўбачыў няшчасьце, першы кінуў таварышоў. Асабліва абураюцца яны за сьмерць шведзкага вучонага Мальгрэна. Як вядома, Мальгрэн астаўся на крызе лёду разам з двумя італьянцамі — Цаппі і Маріяно. Мальгрэн быў вельмі пакалечаны і хворы, ня мог ісьці далей; італьянскія таварышы зьдзёрлі з яго вопратку, забралі ад яго жыўнасьць і пакінулі яго. Мальгрэн пасьля памёр галоднай сьмерцяй. Італьянцы спадзяваліся затаіць ад сьвету свае барбарства, але гэта ім не ўдалося. Радавы лятун Чухноўскі добра бачыў, што на крызе разам з імі ляжаў трэці чалавек, гэта значыць Мальгрэн. Італьянцы выпіраюцца гэтага, як могуць, але факты самі гавораць за сябе. Чухноўскі, у рэвэляцыях, дадзеных ім радавай прэсе, вельмі зьдзіўлены, чаму „Красін“ знайшоў толькі двох разьбіткаў. Чухноўскі і яго таварышы зусім выразна бачылі трох людзей: адзін стаяў, другі сядзеў скорчаны, а трэцьці ляжаў на зямлі, распасьцёрты ў форме літары А. Паверхня крыгі вынасіла ўсяго 30 квадратовых мэтраў. Чухноўскі акружыў гэту крыгу пяць разоў і адляцеў толькі тагды, калі добра прыглянуўся кожнай драбязе на крызе. Апрача таго, Чухноўскі зрабіў фільмавыя зьнімкі, на якіх добра відаць, што на крызе было трое людзей. Заходзіць ярыпушчэньне, што Цаппі і Маріяно пабаяліся паказаць труп Мальгрэна, бо перад тым, як кажа Фама, зьелі частку яго цела.

Апінія ўсяго сьвету аб барбарстве фашыстаўскай выправы прыпала не да смаку італьянскім фашыстам, а асабліва самому Мусоліні. Загадаў ён, каб выратаваныя разьбіткі нічога не апавядалі аб сваіх прыгодах на лёдзе, а таксама не дапускалі да сябе карэспандэнтаў не італьянскіх газэтаў, фатаграфаў і фільмавых апэратараў. Хацеў ён затаіць палахлівасьць і бязраднасьць да няшчасных ягонага генэрала Нобіле, а таксама барбарства, а можа і людаедства іншых фашыстаўскіх падарожнікаў. Але шыла з мяшка заўсёды вылезе, так і тут, — сьвет хутка дазнаецца ўсей праўды. Сусьветная апінія дамагаецца стварэньня спэцыяльнай камісіі, якая-б падрабязна дасьледзіла-б усе факты і гэтым адкрыла тую заслону, якой хоча закрыць Мусоліні падзеі няшчаснай экспэдыцыі.

Характэрна, што чэскі вучоны, праф. Бегунэк не схацеў варочацца назад з сваімі італьянскімі таварышамі, а паехаў асобна, дакляруючы, што, як паправіцца, зробіць даклады одчыт з падарожы. Нобіле з сваімі фашыстаўскімі таварышамі вярнуўся ў Рым у спэцыяльны заплёмбаваным цягніку. Падарожа яго ў гэтым цягніку трымалася ў вялікай таямніцы, відавочна, з баязьні пометы з боку абуранай людпасьці.

Апошнія весткі падаюць, што, калі крыгалом „Красін“ прыйшоў ратаваць разьбіткаў, Цаппі меў на сабе тры пары ботаў, (свае, Мальгрэна і Марыяно), і тры пары вопраткі ў той час, калі Маріяно сядзеў скорчаны на лёдзе ў аднэй падзёртай куртцы і меў на нагах толькі адны шкарпэткі бяз ботаў. Як і калі Цаппі наважыўся забраць ад свайго хворага і галоднага таварыша яго вопратку, засталася таямніцай. Абое італьянцаў не далі пра гэта ніякіх выясьненьняў. Маріяно быў такі хворы, што ня можна было з. ім зусім разгаварыцца. Гэта яшчэ адна краска фашыстаўскага барбарства, а трэба спадзявацца, што такіх кветак мы яшчэ даведаемся з часам ня мала!

Данская газэта „Політікен“ падае цікавыя лічбы датычна коштаў ратаваньня разьбіткаў. У шуканьні разьбіткаў прыймала ўдзел 20 аэрапланаў і столькі сама караблёў. Апрача таго, вырушыла з дапамогай 12 экспэдыцыяў на санках, запрэжаных сабакамі. Агулам шукала разьбіткаў некалькі тысячаў людзей, пры чым кошты ўсіх экспэдыцыяў дасягаюць да чатырох мільёнаў злотых. Кожны дзень шуканьня каштаваў 200.000 злотых. Дык вось, колькі стратаў, апрача стратаў ў людзях, каштавала лёгкадумная і ганорыстая экспэдыцыя! Гэта самая газэта „Політікен“ піша: „З аднаго боку — „Італія“ і Нобіле. За імі—фашызм. З другога боку— „Красін“ і Самайловіч. За імі—бальшавізм, радавая рэспубліка, якую да сёньня зьняважае „культурная“ Эўропа, як барбрскую і жорсткую старонку. Але вось гэтыя самыя „барбары“, гэтыя самыя „ворагі цывілізацыі і культуры“ на першы кліч аб дапамозе, кінуліся нясьці яе і выконвалі бяз шуму, без рэклямы, без сынтэмэнтальнасьці“. І далей выхвальвае геройства „Красіна“, стаўляючы радавы саюз на першае месца ў сусьветнай цывілізацыі. Француская часопісь „L'Oeuvre“ зьмяшчае наступнае маленькае супастаўленьне фактаў:

„Бальшавік Чухноўскі ў часе свайго разведачнага лёту апынуўся на крызе і паведаміў таварышаў, якія хацелі яго ратаваць: „Перш ратуйце другіх“. Чухноўскі адсунуўся на бок. Фашыстаўскі генэрал Нобіле дазволіў выратаваць сябе самога. Не сябе, але сваіх таварышаў адсунуў генэрал на бок—тых самых, якіх сам кінуў у няшчасьце.

„Гэта—кантраст—канчае „L'Oeuvre“, які дазваляе шмат чаго думаць“.

Янка Маланка.

З Радавае Беларусі.

Ажыўленьне працы Радаў у БСРР.

„Kur. Wil.“ з 8 г. м. падае вестку з Менскай „Звезды“ аб ажыўленьні працы вясковых і раёнамх Радаў у БСРР — на падставе пастанаўленьня XI Зьезду Беларускай Камуністычнай Партыі. Ажыўленьне мае быць у сувязі з апіраньнем Радаў на дакладных бюджэтах.

„У Сібіры, піша „Kur. Wil.“ 25 процан. агульнага ліку вясковых Радаў мае свае ўласныя бюджэты, на паўночным Каўказе 42 проц.. а ў нямецкай рэспубліцы на Волзе праца ўсіх вясковых Радаў апіраецца на ўласным бюджэце. У Радавай-жа Беларусі толькі 4 проц. вясковых Радаў маюць уласныя бюджэты, што перашкаджае разьвіцьцю працы радаў і выклікае канешнасьць іх направы“.

Паштовая скрынка.

П. Алейніку з Аргэнтыны. З найвялікшай ахвотай хацелі-б скарыстаць Вашыя матар'ялы. але гэта пагражае канфіскатаю нашай газэце. Два нумары падрад былі канфіскаваныя за артыкулы, у якіх мы хацелі выказаць наш пратэст над гэткай крыўдай усяго народу. — **Агню.** Вашыя карэспандэнцыі вочы паляць цэнзарам, але за „Панскія рэформы“ можа не канфіскуюць. Апавяданьне, што Вы калісь прыслалі да друку, не падыходзіць, верш пайшоў на разгляд у рэдакцыю новай часопісі. Спрабуйце пісаць фэльетоны — яны ў Вас будуць добра выходзіць, бо Вы з гэтага боку маеце здольнасьць. — **Сумуючаму, Немаўкліваму і Адважнаму.** З прысланага скарыстаем. — **С. Сіняку.** Вершы добрыя. Зважайце на разьмер і форму. Пішэце. Пераклады зьмесьцім у наступным нумары. Пішэце на адным боку паперы. — **В. Шкодзічу.** У вершах ухіляйцеся ад г. зв. дзеяслоўнай рымы (стаяць—стагнаць і г. д.); у Вашых вершах добрыя вобразы. Працуйце. Будзем, па магчымасьці, зьмяшчаць.

Рэдактар-Выдавец: Язэп Машчоньскі.
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.